


бібліятэка Свабоды XXI стагодзьдзе

Сяргей Абламейка

Каліноўскі і палітычнае нараджэньне Беларусі

Радыё Свабода

Каліноўскі і палітычнае нараджэньне Беларусі



Сяргей Абламейка

Каліноўскі і палітычнае нараджэньне Беларусі

Гісторыка-філязофскае эсэ

Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода

Сяргей Абламейка. Каліноўскі і палітычнае нараджэньне Беларусі. (Бібліятэка Свабоды. ХХІ стагодзьдзе). — Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2020. — 132 с.: іл.

Бібліятэкар Свабоды
Аляксандар Лукашук

Рэдактар *Аляксандар Лукашук*
Мастак *Генадзь Мацур*
Карэктар *Сяргей Шупа*

Доктар гісторыі Сяргей Абламейка па-новаму разглядае асобу і дзейнасьць Кастуся Каліноўскага і бачыць за яго сацыяльнай рыторыкай глыбокі нацыянальны зьмест. Днём нараджэньня мадэрнай Беларусі, якая раней існавала пад назвамі і Русь, і Літва, аўтар прапануе лічыць 1 лютага 1863 году, калі ў Вільні быў утвораны Часовы правінцыйны ўрад Літвы і Беларусі на чале зь Вінцэнтам Канстанцінам (Кастусём) Каліноўскім.

ISBN 978-0-929849-73-7

Зьмест

Што пачынаецца, калі канчаецца ўсё

Здымуць зь пятлі, скінуць у яму, заліюць вапнай, засыплюць жвірам, здратуюць, забудуць, успомняць, паставяць крыж, зьнясуць, зноў забудуць і ня схочуць успамінаць, але не дадуць рады, калі ён паўстане. І тады ачуняюць, жахнуцца, заплачуць, памоляцца, ушануюць, усьцешацца, каб ужо не забыцца ніколі.

А сам ён — ён стане сваёй краінай.

Намі.

Аляксандар Лукашук,
Радыё Свабода

Дзень народзінаў

Вялікая загадка беларускай гісторыі — нараджэньне Беларусі як краіны.

З аднаго боку, мы, беларусы, лёгка прызнаем, што маем маральнае права са зваротнай сілай называць беларускім усё, што стварылі і мелі продкі на нашай зямлі аж з часоў Полацкай дзяржавы. А таксама саміх гэтых продкаў.

Зь іншага боку, гісторыкі так і не прыйшлі да згоды адносна дакладнага вызначэньня паняцьцяў «беларускі народ», «беларуская нацыянальная ідэя», «беларуская нацыя» і нават «беларуская нацыянальная палітыка». Спрачаюцца і пра тое, калі гэта ўсё як сацыяльна-гістарычны фэномэн узьнікла.

Адказы на гэтыя пытаньні губляюцца ў смузе часу і мностве гістарычных канцэпцый і поглядаў, народжаных за апошняе стагодзьдзе.

Калі мова ідзе пра паняцьці з прыметнікам «нацыянальны», то зразумела, што маецца на ўвазе пэрыяд ад канца XVIII стагодзьдзя да нашага часу. Якраз у гэты прамежак гісторыі пакладаюцца ўсе наяўныя ў беларускім інтэлектуальным дыскурсе канцэпцыі.

Калі ж гаворка заходзіць пра нацыю, нельга абысьціся без палітыкі. Палітычная пастаноўка нацыянальных мэтаў і іх палітычная абарона сьведчаць пра тое, што працэс нацыянальнай кансалідацыі зайшоў дастаткова далёка.

У нашым выпадку, гэта азначае пэрыяд, калі частка гістарычных ліцьвінаў і частка гістарычных русінаў зь ліку адукаваных прадстаўнікоў грамадзтва вырашылі ідэнтыфікаваць сябе як беларусаў на падставе сваёй, або сваіх продкаў, «рускай» мовы — так у Вялікім Княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай называлі беларускую мову ў XIV–XVIII стагодзьдзях.

Калі гэта здарылася зь Беларусьсю ў яе сёньняшнім значэньні?

Хто стаяў ля вытокаў беларускай палітычнай ідэі?

Сёньня мы можам назваць дакладны год, месяц і дзень палітычнага нараджэньня сваёй краіны.

Гэта адбылося, калі ў Вільні быў утвораны Часовы правінцыйны ўрад Літвы і Беларусі на чале зь Вінцэнтам Канстанцінам (Кастусём) Каліноўскім.

Дата на календары — 1 лютага 1863 году.

Сьцісла:

- Беларуская нацыянальная ідэя ўзьнікла ў пачатку XIX стагодзьдзя ў асяродзьдзі адукаваных уніяцкіх сьвятароў.
- У першай палове XIX стагодзьдзя, якую называць пэрыядам літаратурнага абуджэньня Беларусі, беларускую нацыянальную ідэю актыўна падтрымалі многія прадстаўнікі беларускай шляхты.
- Галоўнымі прапагандыстамі назвы «Беларусь» у першай палове XIX стагодзьдзя былі ўраджэнцы Вільні, Беласточчыны і Горадзеншчыны.
- Распаўсюдзіць назву «Беларусь» з паўночнага ўсходу на ўсю краіну вырашылі самі заходнебеларускія ліцьвіны і русіны, калі захацелі выразна адрозьніць сябе ад балцкага насельніцтва гістарычнай Літвы на падставе сваёй (або сваіх продкаў) «рускай» мовы.
- Першым чалавекам, які загінуў за новую Беларусь, стаў ураджэнец Вільні, шляхціц Рамуальд Падбярэскі.
- Канчаткова назву «Беларусь» за сучаснай тэрыторыяй краіны замацавалі паўстанцы 1863–1864 гадоў. Гарачым прыхільнікам гэтага быў Кастусь Каліноўскі і яго найбліжэйшыя паплечнікі.
- Паўстаньне 1863–1864 гадоў мела выразную нацыянальную ідэалёгію, якую адстойвалі Каліноўскі і яго паплечнікі.

- Дагэтуль гісторыкі ня бачылі за сацыяльным радыкалізмам Каліноўскага нацыянальнай ідэі.
- Каліноўскі абапіраўся на сялян і дробную шляхту, бо яны былі носьбітамі беларушчыны, а буйную шляхту лічыў польскаю. Ён хацеў забраць беларускую зямлю з рук палякаў і перадаць яе ў рукі беларусаў.
- Напярэдадні паўстаньня і падчас яго патрыятычная моладзь выкарыстоўвала сялянскія сьвіткі так, як сёньня беларуская моладзь выкарыстоўвае вышыванкі. Адзін з псэўданімаў Каліноўскага — Васіль Сьвітка.
- У абароне Каліноўскім Уніяцкай царквы быў нацыянальны аспэкт. Ён хацеў паставіць заслону перад асыміляцыяй беларусаў з боку расейцаў і палякаў.
- Менавіта памяць пра Унію і антыправаслаўныя настроі сялян, а не жаданьне шляхецкіх рэвалюцыянэраў вярнуць народ у каталіцтва, нарадзілі ў паўстанцкай публіцыстыцы заклікі да вяртаньня Ўніяцкай царквы.
- Каліноўскі быў перакананым прыхільнікам незалежнасьці Літвы і Беларусі ад Польшчы і Расеі.
- 1 лютага 1863 году ў Вільні быў створаны Часовы правінцыйны ўрад Літвы і Беларусі пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Гэта была першая ў гісторыі праява палітычнай суб’ектнасьці новай Беларусі.

- 1 лютага 1863 году можна лічыць днём палітычных народзінаў новай Беларусі, якая дагэтуль існавала пад гістарычнымі назвамі і Русь, і Літва.
- У чэрвені 1863 году быў створаны другі ўрад Каліноўскага — «Чырвоны жонд», які пасьля роспуску лютаўскага ўраду аднавіў палітычную суб'ектнасьць Беларусі.
- У сярэдзіне — другой палове XIX стагодзьдзя мадэрнай Польшчы не ўдалося цалкам усьвядоміць сябе ў межах Рэчы Паспалітай, бо гэтаму перашкодзіла дзейнасьць Каліноўскага і яго паплечнікаў.
- Падзеі 1863–1864 гадоў прывялі да вылучэньня з агульнапольскага руху беларускага і літоўскага нацыяналізмаў.
- Беларусь тады асэнсавала сябе ў сваіх геаграфічных і этнічных межах, якім яшчэ толькі належала ў будучыні стаць дзяржаўнымі.
- У «Лістах з-пад шыбеніцы» ўтрымліваюцца яшчэ не сыстэмна сфармуляваныя, але ўжо дакладна акрэсьленыя 10 пастулятаў беларускай нацыянальнай ідэі. Усе яны дагэтуль актуальныя.
- Каліноўскі стаў першым беларускім палітыкам. Яго дзейнасьць і ідэалёгія паклалі пачатак палітычнаму нараджэньню мадэрнай Беларусі.
- Вінцэнт Канстанцін (Кастусь) Каліноўскі зьяўляецца айцом-заснавальнікам беларускай нацыі.

I
НАРАДЖЭНЬНЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ

Як слова «нацыя» і вытворныя ад яго блытаюць галовы

Тэрмін «нацыянальны» — амбівалентны, ён мае і палітычны (сацыялягічны), і этнічны зьмест. З аднаго боку, мы кажам, што нацыі ўзьніклі ў часы мадэрну, і вызначаем іх розныя тыпы, а зь іншага боку кажам «нацыянальныя строі беларусаў», маючы на ўвазе чыста этнічную зьяву.

Гэтай амбівалентнасьці ня трэба баяцца і ня трэба зацыкліваецца на адным зь яе бакоў. У рэшце рэшт, на сьвеце існуе беларускі народ, які жыве ў сваёй дзяржаве Беларусі. Гэта ён стварыў беларускую нацыю, да якой пры жаданьні могуць свабодна далучыцца (і далучаюцца) іншаэтнічныя жыхары Беларусі.

Адпраўным пунктам нацыі лічыцца момант, калі з народных шэрагаў вылучаецца вялікая

група людзей, якая ставіць сабе за мэту абарону правоў гэтага народу палітычнымі сродкамі.

Таму кажуць, што беларуская нацыя заявіла пра сябе тады, калі Вацлаў Іваноўскі, браты Іван і Антон Луцкевічы і іншыя беларускія дзеячы стварылі ў 1903 годзе першую беларускую палітычную партыю — Рэвалюцыйную грамаду.

Але палітыка — ня толькі партыі і ўрады. Палітычным дзеяньнем можа быць, напрыклад, і вайна, якую прускі генэрал Карл фон Кляўзэвіц называў працягам палітыкі іншымі сродкамі.

Дык вось, Кастусь Каліноўскі разам з паплечнікамі стварыў нелегальную палітычную арганізацыю і пасьля палітычнай і культурнай падрыхтоўкі ў форме распаўсюджваньня газэт і праклямацый пачаў узброеную барацьбу (вайну) за самастойнасьць і незалежнасьць беларускага народу.

У дакумэнтах паўстаньня і тэкстах Каліноўскага канчаткова выкрышталізаваліся тэрміны «Беларусь» і «беларускі».

Беларушчына да Каліноўскага

Беларуская нацыянальная ідэя ўзьнікла ў самым канцы XVIII — пачатку XIX стагодзьдзяў у асяродзьдзі адукаваных уніяцкіх сьвятароў.

Гэта не азначае, што тады пачаў фармавацца новы этнічны ці нацыянальны арганізм. Наш народ меў сваю моўна-культурную ідэнтычнасьць ад самага часу ўзьнікненьня асноўных рыс бела-

рускай мовы ў VIII–IX стагодзьдзях. Пацьверджаньне гэтаму — факт існаваньня і гісторыя Полацкай дзяржавы.

Калі мы кажам пра ўзьнікненьне беларускай нацыянальнай ідэі, мы маем на ўвазе пачатак працэсу замены тэрмінаў «русін» і «рускі» на тэрміны «беларус» і «беларускі» самімі іх носьбітамі — жыхарамі былога Вялікага Княства Літоўскага. Часткова гэта тычыцца і тэрміну «ліцьвін».

З другой паловы XVIII стагодзьдзя ў літаратурнай творчасьці старабеларуская пісьмовая традыцыя пачынае выцясьняцца новай, больш набліжанай да гутарковай мовы.

У 1826 годзе на публічным адкрыцьці курсу славяназнаўства ў Галоўнай духоўнай сэмінарыі Віленскага ўнівэрсытэту ўніяцкі сьвятар, прафэсар Міхал Баброўскі заявіў, што дзяржаўнай мовай ВКЛ і мовай літоўскіх статутаў была «беларуская мова».

У 1837 годзе пачынаецца выданьне фальклёрных зборнікаў, дзе ўжо фігуруе тэрмін «беларускі».

У 1838 годзе ў віленскім альманаху «Bojan» друкуецца «Песьня на беларускай гаворцы». Так рэдакцыя назвала верш «Скажы, вяльможны пане...» беларускага паэта Ігната Легатовіча, які нарадзіўся ў вёсцы Малая Капліца пад Горадняй.

У 1840 годзе ў Парыжы паэт і фальклярыст Аляксандар Рыпінскі выдае кнігу «Беларусь».

У 1842 годзе чэскі славіст Павел Шафарык выдае ў Празе «Славянскі народапіс», дзе ставіць

беларускую мову ўпаравень зь іншымі славянскімі мовамі.

У 1843 годзе выкладчык Полацкага духоўнага павятовага вучылішча Іосіф Цытовіч пачынае прапагандаваць у расейскім друку Беларусь і беларускую мову.

У 1844 годзе ў Санкт-Пецярбургу пачынаецца выданьне «Rocznika Literackiego» пад рэдакцыяй крытыка і публіцыста, аўтара «Лістоў пра Беларусь» Рамуальда Падбярэскага. У Санкт-Пецярбургу дзейнічае беларускі гурток, удзельнікам якога зьяўляецца Падбярэскі.

У тым самым 1844 годзе Падбярэскі ў рэцэнзіі на музычную паэму кампазытара Антона Абрамовіча «Беларускае вясельле» ўпершыню заяўляе пра «беларускую нацыянальнасьць»:

> «Ідэя беларускіх паэтаў адносна праяўленьня нацыянальнасьці ў мастацтве пачынае выказвацца і ў музыкаў».

У 1845 годзе ў расейскім часопісе «Маяк» выходзіць друкам беларуская паэма «Энэіда навыварат» Вікенція Равінскага.

У сярэдзіне 40-х гадоў XIX стагодзьдзя ў Санкт-Пецярбургу выходзяць чатыры тамы «Шляхціца Завальні, або Беларусі ў фантастычных апавяданьнях» Яна Баршчэўскага.

У 1846 годзе Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч выдае дзьвюхмоўную п’есу «Сялянка».

У 1848 годзе Ўладзіслаў Сыракомля вітае рэвалюцыйную «вясну народаў» вершам на беларускай мове «Добрыя весьці».



Рамуальд Падбярэскі

У 1849 годзе ў Вільні складаецца праект беларускага часопісу. У сьнежні таго году кампазытар Станіслаў Манюшка піша ў Менск літаратару, музычнаму крытыку і выдаўцу Аляксандру Валіцкаму:

> «Падбярэскі закончыў выданьне першага тома «Паментніка»... здаецца, што ён будзе рэдактарам беларускага часопісу, пра які мы зноў пачынаем гаварыць...»

Але ў наступным годзе ў Вільні і іншых месцах Беларусі адбываюцца арышты групы грамадзкіх і культурных дзеячоў. Рамуальда Падбярэскага высылаюць у Архангельскую губэрню, дзе ён памірае ў 1856 годзе.

Вось гэтага ўраджэнца і выхаванца Вільні і трэба лічыць першай ахвярай і першым героем новай Беларусі.

Беларусь і беларуская мова ў сярэдзіне XIX стагодзьдзя

Беларусьсю ад XVII стагодзьдзя называлі Полаччыну, Віцебшчыну і Магілёўшчыну. Астатняя частка сёньняшняй Беларусі называлася Літвой.

Менавіта пра Полаччыну і Віцебшчыну пісаў Рамуальд Падбярэскі ў сваіх «Лістах пра Беларусь».

Можна казаць, што ў 40–50-я гады XIX стагодзьдзя існавала адрознае тэрытарыяльнае разуменьне Беларусі і беларускай мовы. Беларуская мова ахоплівала сабой і тагачасную Беларусь, і большую частку гістарычнай Літвы.

Дзе ёсьць мова, там ёсьць і яе носьбіт — народ. На вокладцы кнігі «Гапон» Дуніна-Марцінкевіча, выдадзенай у 1855 годзе ў Менску, было напісана, што гэта «беларуская аповесьць... на мове беларускага народу». Паколькі Менск знаходзіўся ў гістарычнай Літве, то ў гэтым выпадку мы маем справу з парасткамі разуменьня, што беларускі народ жыве ня толькі ў Беларусі, але і ў Літве. Дунін-Марцінкевіч ня мог прызначаць свае кнігі толькі для Віцебшчыны.

У 50-я гады XIX стагодзьдзя зьяўляюцца тэксты Ўладзіслава Сыракомлі і Віктара Каліноўскага (брата Кастуся), дзе беларуская мова называецца крывіцкай гаворкай. Але тэрмін «крывіцкая» ў іх ідзе на другім месцы, як удакладненьне пасьля тэрміну «беларуская», каб падкрэсьліць яе старажытнасьць.



HAPON,

Powieść białoruska, z prawdziwego zdarzenia, w języku białoruskiego ludu napisana.

Ozdobiona 4 Rycinami.

PRZEZ

Wincentego Dunin Marcinkiewicza.

MIŃSK.

NAKŁADEM KSIĘGARZY MIŃSKICH, BRACI BEJLINÓW.

1855.

Вокладка кнігі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Гапон»

«Вечарніцы» напісаны на беларускай або, дакладней, крывіцкай мове. Пекная гэта галіна славянскай мовы... і старая! Бо гэта мова нашага Літоўскага статуту і заканадаўства... на ёй размаўлялі тры чвэрці даўняй Літвы, народ, шляхта і

паны», — пісаў у 1855 годзе Сыракомля пра творы Дуніна-Марцінкевіча.

Сам Дунін-Марцінкевіч у тым самым 1855 годзе канстатаваў:

> «Я пад старасьць зрабіўся песьняром беларускага народу»,

а празь некалькі гадоў яго калега, паэт Арцём Вярыга-Дарэўскі ў лісьце да Адама Кіркора заявіў:

> «Зь Беларушчынай не разбратаўся. Гэта мой ідэал. Можа дарэмна на яе трачуся. Што ж рабіць — "Па Хомку шапка"».

Важным для беларускай мовы і ўсёй беларускай культуры стаў 1858 год. У пачатку верасьня Вільню наведваў расейскі імпэратар Аляксандар II. Падчас знаходжаньня ў сталіцы былога Вялікага Княства Літоўскага манарху быў уручаны дыхтоўна выдадзены Адамам Кіркорам «Віленскі альбом». У альбоме, сярод іншага, былі зьмешчаны і два вершы на мовах аўтахтоннага насельніцтва краю — па-беларуску і па-літоўску. Аўтарам беларускага верша быў Вінцэсь Каратынскі. За гэты альбом польская эміграцыя ў Парыжы абвінавaціла Кіркора ў здрадзе нацыянальным інтарэсам.

Наогул, тады ў Вільні сабралася шмат літоўска-беларускай шляхты прагрэсіўных поглядаў для перадачы цару просьбы аб скасаваньні прыгону. І вось напярэдадні прыезду Аляксандра II у Вільні адбыўся ні многа ні мала... першы зьезд беларускіх пісьменьнікаў. У ім бралі ўдзел літаратар і гісторык Адам Кіркор, паэты Ўладзіслаў Сыракомля, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Арцём

Вярыга-Дарэўскі, Вінцэсь Каратынскі і некалькі іх маладзейшых калегаў.

Пісьменьнікі абмеркавалі становішча беларускай мовы, культуры і літаратуры, а таксама склалі вялікі і амбітны плян асьветнай, выдавецкай і літаратурнай працы. На думку ўдзельнікаў сходу, менавіта літаратура на беларускай мове магла аб'яднаць народ, які належаў да розных станаў і розных веравызнаньняў.

У расейскіх уладаў, аднак, былі іншыя пляны. У наступным 1859 годзе быў канфіскаваны і зьнішчаны беларускі пераклад міцкевічаўскага «Пана Тадэвуша», зроблены Дунінам-Марцінкевічам.

Беларусь і Літва ў публіцыстыцы паўстаньня

Тэрмін «Літва» ў галовах і тэкстах паўстанцаў меў амбівалентны характар. Мовы яны адрозьнівалі дакладна, а вось з нацыянальным зьместам паняцьця «Літва» часам была блытаніна. Адны называлі Літвой цэнтральную частку былога ВКЛ, іншыя — увесь яго былы абшар.

Да таго ж у асяродзьдзі паўстанцаў суіснавалі розныя ідэалягічныя і культурныя плыні і погляды. Адны зь іх беларускіх мужыкоў называлі палякамі, другія — літоўцамі, трэція — беларусамі. Пра гэта сьведчаць апублікаваныя і неапублікаваныя дакумэнты паўстаньня.

У адным з такіх тэкстаў, які беларускі гісторык Генадзь Кісялёў усьлед за многімі сваімі калегамі

зь Беларусі, Польшчы і Расеі лічыў прыпісанай Каліноўскаму падробкай варшаўскіх дзеячоў, гаварылася:

«мы, хто жывемо на зямлі Польскай, што ямо хлеб Польскі, мы Палякі ад векаў вечных».

У другім — не надрукаваным нумары «Мужыцкай праўды» ад 1862 году — гаварылася:

«Зямля наша зь вякоў вечных называецца літоўская, а мы то называемся Літоўцы».

У трэцім — ставілася пытаньне аб школах на роднай мове і аб праве на свабоднае разьвіцьцё ўсіх народаў былой Рэчы Паспалітай:

«Масква перасьледуе мову польскую, беларускую, маларускую, літоўскую і навязвае масковскую; мы хочам, каб кожная мова разьвівалася паводле ўласнай жыцьцяздольнасьці: і літоўская, і беларуская, і маларуская, і польская»,


— пісаў падпольны «Głos z Litwy» праз тыдзень пасьля пакараньня сьмерцю Кастуся Каліноўскага.

У выдадзеным у чэрвені 1863 году ў Вільні беларускамоўным «прыказе» Кастусь Каліноўскі зьвяртаўся «да народу зямлі Літоўскай і Беларускай».

Як бачым, ужо былі беларускія мова, народ і зямля. Зусім мала заставалася і да зьяўленьня краіны.

Нарэшце, у 1863 годзе ў назьве ўраду і ў паролі паўстанцаў зьяўляецца краіна Беларусь: «Каго любіш? — Люблю Беларусь! — То ўзаемна!»

Зразумела, што Каліноўскі і яго паплечнікі не маглі любіць выключна Віцебшчыну і Ма-


для сви-
данія съ Калиновскимъ въ квартиру. Я между тѣмъ
я воспользовался даннымъ въ Могилевѣ Жуков-
скимъ адресомъ къ госпожѣ Баневичъ (Улица Доми-
никанская, въ Доминиканскомъ зданіи, надъ аптекою Савиц-
каго). Прійдя въ ея квартиру, я засталъ Баневичъ
дома и сказалъ лозунгъ "кого любишь", на что она
должна была отвѣтить "люблю Бѣлорусь", и
наконецъ я обязанъ былъ требовать "такъ взаимно",
но она встревожилась —, какъ помню объявила моей
фамиліи, по которой будтобы взятъ былъ Далевскій,
котораго она называла Титусомъ и сколько я
могъ замѣтить знала хорошо, неотвѣчала

Пароль паўстанцаў. З пратаколу допыту Вітольда Парфяновіча

гілёўшчыну. Тым больш, што, як даказана мовазнаўцамі, публіцыстыка паўстаньня, у тым ліку тэксты Каліноўскага, утрымліваюць асаблівасьці гарадзенскіх беларускіх гаворак. З Гарадзеншчыны паходзілі і члены рэдакцыі «Мужыцкай праўды» Валеры Ўрублеўскі і Фэлікс Ражанскі.

Гэтак яны знайшлі сваю краіну.

Сучасьнікі пра сэпаратызм Каліноўскага

Кастусь Каліноўскі, бясспрэчна, зьяўляецца першым беларускім палітычным дзеячом і першым змагаром за незалежнасьць Беларусі.

Пра гэта ў адзін голас сьведчаць усе сучасьнікі Каліноўскага, якія пакінулі ўспаміны пра яго. Пра тое самае сьведчаць матэрыялы сьледчай

справы і тэксты расейскага гісторыка паўстаньня генэрала Васіля Ратча.

> «Константин Калиновский… во главе честолюбивейших личностей из красных литвинов настойчиво проводил идею о самостоятельности Литвы»

— пісаў Ратч у «Сведениях о польском мятеже» і пераказваў адну з фразаў Каліноўскага:

> «Такой бестолковой башке, как Варшава, нельзя вверять будущую судьбу Литвы».

З запісак Ратча мы ведаем, што вайсковы кіраўнік паўстаньня Зыгмунт Серакоўскі

> «мечтал об образовании конфедеративного государства, соединенного в одной нераздельной Польше, но в которое бы Литва вошла, имея своих представителей»,

а вось

> «Калиновский стоял внимательным сторожем интересов Литвы и отстаивал, чтобы средства и силы Литвы вовсе не шли бы на дело Царства Польского. Литва, говорил он своим интимным, должна воспользоваться разладом между Россиею и Польшею и сделаться самостоятельною».

Адзін зь лідэраў паўстаньня Якуб Гейштар у сваіх мэмуарах называе Каліноўскага перакананым літоўскім сэпаратыстам.

Варшаўскі ўдзельнік паўстаньня Юзаф Яноўскі пісаў, што Каліноўскі «адносіны Літвы і Польшчы разумеў толькі як фэдэратыўныя — з поўнай незалежнасьцю Літвы».

Гісторык паўстаньня Баляслаў Ліманоўскі пісаў, што Каліноўскі «раўніва пільнаваўся поўнай роўнасьці і самастойнасьці Літвы».

Польскі гісторык Валеры Пшыбароўскі сьцьвярджаў, што Каліноўскі

«быў адным з галоўных прыхільнікаў і папулярызатараў сэпаратысцкіх літоўскіх памкненьняў і не адзін раз выказаўся на сваёй сакавітай народнай мове, што “дурным варшаўскім мазгаўням нельга давяраць лёсы Літвы”... Паводле яго, Літва павінна разам з Польшчай дабівацца незалежнасьці, змагацца за вызваленьне ад чужога захопніка, але складаць асобную адзінку, зусім незалежную ад Польшчы...»

Падобных сьведчаньняў мноства. Калі ж дадаць сюды факт зацятых спрэчак з Варшавай пра межы паміж Польшчай і «Літвой», то перад намі паўстае поўная карціна палітычнай барацьбы Каліноўскага за бацькаўшчыну.

Паводле сьведчаньня асабістага сакратара Каліноўскага Юзафа Яманта, у жніўні 1863 году лідэр паўстаньня вёў вострую палеміку з Варшавай, пратэстуючы супраць плянаў уключыць у склад Царства Польскага Ковенскае і Гарадзенскае ваяводзтвы. Вядомы і факт вострага канфлікту з Варшавай, якая ўзяла на сябе кіраваньне Беластоцкім аддзелам. Каліноўскі рашуча выступіў супраць і дамогся вяртаньня роднай Беласточчыны пад уладу Вільні.

У прыведзеных цытатах, якія належаць этнічным палякам і расейцу — сучасьнікам Каліноўскага, Літвой называлася ўсё былое ВКЛ.

Але мы разумеем, што ўжо выбраўшы Беларусь сваёй радзімай, Каліноўскі і яго паплечнікі змагаліся за ўсё былое Вялікае Княства Літоўскае,



Сакратар кіраўніка «Чырвонага жонду»
Кастуся Каліноўскага Юзаф Ямант (зьлева).
Справа — Эдмунд Вярыга

без асобных Літвы і Беларусі. Яны не маглі яшчэ ўявіць сабе асобнага дзяржаўнага існаваньня славянскай і балцкай частак ВКЛ.

Як не маглі яго ўявіць і беларускія палітыкі, арыстакраты і шляхта нават у пачатку XX стагодзьдзя — Іван і Антон Луцкевічы, Раман Скірмунт, Геранім Друцкі-Любецкі, Эдвард Вайніловіч, Юры Гутэн-Чапскі, Альбрэхт-Антоні Радзівіл і іншыя. Апошняя спроба з боку беларусаў захаваць ВКЛ датуецца 1918 годам.

Крыніцы палітычнага сэпаратызму

Вытокі незалежніцкай пазыцыі Каліноўскага і яго паплечнікаў караніліся ў шматвяковай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Насуперак сьцьвярджэньням многіх гісторыкаў, ВКЛ ад часу свайго заснаваньня ў XIII стагодзьдзі аж да трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе ніколі ня траціла сваёй палітычнай суб'ектнасьці. Ёсьць нават падставы казаць, што ВКЛ заўсёды захоўвала сувэрэнітэт нягледзячы на Люблінскую унію 1569 году і Канстытуцыю 3 траўня 1791 году.

У 1569 годзе ў Любліне ВКЛ і Польшча злучыліся ў Рэч Паспалітую. Акт уніі ў прэамбуле абвяшчаў, што Карона Польская і Вялікае Княства Літоўскае злучаюцца ў «непадзельнае цэлае». Гэта была праграма польскіх магнатаў. А вось у тэксьце акту былі ўлічаныя пажаданьні беларуска-літоўскай эліты.

Гісторыкі праз усё XX стагодзьдзе спрачаліся, што ж узьнікла пасьля 1569 году. Спэктар думак — ад адзінай дзяржавы, праз фэдэрацыю і канфэдэрацыю аж да поўнай незалежнасьці. Славуты гісторык Станіслаў Закшэўскі лічыў Рэч Паспалітую саюзам незалежных дзяржаў.

Так ці іначай, паводле ўмоваў уніі, манарх, заканадаўчы орган (Вальны сойм) і зьнешняя палітыка былі адзінымі, а ўсё астатняе — асобным. Але неўзабаве і гэтыя дасягненьні палякаў былі перакрэсьленыя.



Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 году

Эліты ВКЛ так моцна цанілі незалежнасьць, што заявілі, што не прызна́юць выбранага ў 1587 годзе караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазу, калі ён не зацьвердзіць новы Статут. Кароль быў вымушаны Статут падпісаць нягледзячы на вялікае супраціўленьне палякаў.

«Так у Вялікім Княстве набыў сілу галоўнага закону звод новых прававых нормаў, які, па сутнасьці, адмаўляў прынцыпы дзяржаўнай уніі з Каронай», — пісаў гісторык Генадзь Сагановіч

Найважнейшыя палажэньні Статуту 1588 году і наступствы яго прыняцьця:

1. Пра Люблінскую унію ў Статуце ня згадвалася ні словам.
2. ВКЛ захавала Вальны сойм, які стаў называцца Вальным зьездам або канвакацыяй.
3. Статут сьцьвярджаў, што найважнейшыя зьнешнепалітычныя пытаньні (вайна і мір, скліканьне паспалітага рушэньня і іншыя) вырашаюцца толькі Вальным соймам (зьездам) ВКЛ.
4. На тэрыторыі ВКЛ Статут скасаваў раўнапраўе кароннай шляхты са шляхтай ВКЛ, трактуючы першую як чужаземную.
5. Польскай шляхце зноў было забаронена купляць зямлю ў ВКЛ.
6. Польская шляхта не магла займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ.
7. Нават для праходжаньня польскага войска па тэрыторыі ВКЛ патрабавалася згода вялікага князя і паноў-рады.
8. Пасьля прыняцьця Статуту 1588 году абедзьве дзяржавы засталіся сувэрэннымі, захаваўшы свае ўрады, войска, грошы, судовую сыстэму і заканадаўства. Іх аб'ядноўваў толькі супольны манарх і сойм.
9. Але і манарх пасьля абраньня на сойме павінен быў праходзіць цырымонію паўторнага зацьвярджэньня і прысягі ў Вільні як вялікі князь.

Асобнае дзяржаўнае існаваньне ВКЛ, таксама насуперак меркаваньням многіх гісторыкаў, не зьмяніла і прыняцьце Соймам Рэчы Паспалітай Канстытуцыі 3 траўня 1791 году.

Ужо 20 кастрычніка таго году да Канстытуцыі была прынятая папраўка пад назвай «Узаемныя заручыны абодвух народаў». Гэты дакумэнт, прыняты паводле настойлівых патрабаваньняў эліты ВКЛ, гарантаваў далейшае існаваньне цэнтральных літоўскіх установаў і міністраў, уласную скарбовую касу і падаткі, асобны судовы лад, уласную сыстэму права і г. д.

Польскі гісторык Юліюш Бардах наступным чынам ахарактарызаваў становішча пасьля 1791 году:

> «Узаемныя заручыны абодвух народаў былі саступкаю ліцьвінам, якія баранілі сваю палітычную суб'ектнасьць. Кампраміс адбыўся ў рамках існуючай фэдэрацыі... Гэта мацавала повязь паміж «палітычнымі народамі» Кароны і Вялікага Княства, а адначасна давала ліцьвінам магчымасьць захаваць традыцыю ўласнай дзяржаўнасьці...»

Магнаты і шляхта ВКЛ вякамі адстойвалі сваю самастойнасьць. Сэпаратызм Каліноўскага і яго аднадумцаў быў працягам гэтай шматвяковай традыцыі.

Новым у гэтым быў толькі рост нацыянальнай сьвядомасьці ў асяродзьдзі эліты былога Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове — сярэдзіне XIX стагодзьдзя. Гэты працэс выявіўся ў выбары прадстаўнікамі асьвечаных пластоў грамадзтва (адны зь якіх лічылі сябе ліцьвінамі, а іншыя — русінамі) назвы «Беларусь» і «беларусы».

Ідэйным пасьлядоўнікам і палітычным лідэрам гэтай часткі эліты былога ВКЛ стаў Кастусь Каліноўскі.

І гэта быў другі фактар, другая крыніца ягонага сэпаратызму нароўні з гістарычнай традыцыяй і запаветам яго шляхецкіх продкаў.

Рэвалюцыянэр-радыкал ці патрыёт

Савецкая і нават постсавецкая гістарычныя школы нярэдка называлі Кастуся Каліноўскага рэвалюцыянэрам-дэмакратам. У гады існаваньня Польскай Народнай Рэспублікі дакумэнты паўстаньня захоўваліся ў архіве ЦК Польскай аб'яднанай рабочай партыі. У XX стагодзьдзі Каліноўскага спрабавалі зрабіць ледзь не камуністам.

Такая сацыялягізацыя адсоўвала на другі плян нацыянальны аспэкт ягонай дзейнасьці — гэта адбывалася нават у Польшчы, ня кажучы ўжо пра СССР.

Але і сучасьнікі Каліноўскага называлі яго чырвоным радыкалам і нават «хлапаманам». Жонка Зыгмунта Серакоўскага Апалёнія пісала пра Каліноўскага, што «быў ён сябрам люду — можа, нават хлапаманам».

Якуб Гейштар пісаў у сваіх успамінах:

«...Пры першым маім знаёмстве з Каліноўскім у Далеўскага балюча ўразіла мяне яго тэорыя пра будучае паўстаньне на Літве. На думку Калі-



Кастусь Каліноўскі ў сялянскай сьвітцы

ноўскага, можна разьлічваць толькі на... люд, а шляхту трэба пакінуць убаку».

Вядомыя і больш радыкальныя выказваньні Каліноўскага пра шляхту, нават пагрозы. Напрыклад такое:

«Паўстаньне мае быць чыста народным — шляхта, паколькі з намі ня пойдзе, няхай гіне — тады

сялянская сякера не павінна спыніцца нават над калыскай шляхецкага дзіцяці».

Але гісторыя захавала для нас і больш дакладныя сьведчаньні пра погляды Каліноўскага на рухаючыя сілы паўстаньня. У сваіх «Сведениях» генэрал Ратч засьведчыў, што Каліноўскі зьбіраўся


> «раздать всю поземельную собственность крестьянам и из среды землепашцев составить организацию. Он заявлял, что укажет из мелкой шляхты и из крестьян на способные личности, которые сумеют панов принять в руки…»

Вось ключ, сапраўдны PIN-код для разуменьня грамадзка-палітычных поглядаў Кастуся Каліноўскага! Гэта — яго ашаламляльная згадка ня толькі пра сялян, але і пра «мелкую шляхту».

Менавіта дробная шляхта і сялянства былі ў тыя часы носьбітамі беларускай мовы. Паводле лідэра паўстаньня, той, хто размаўляў па-беларуску, і складаў беларускі народ. А сярэдняя і буйная шляхта былі ўжо спалянізаванымі носьбітамі польскай мовы і польскай нацыянальнай сьвядомасьці.

Вось чаму ён сказаў: «Шляхта з намі ня пойдзе». І вось чаму Каліноўскі спадзяваўся на шляхту дробную і на сялянства — менавіта з апорай на іх ён зьбіраўся пабудаваць свой нацыянальны беларускі дом у выглядзе адроджанай гістарычнай Літвы.

Польская шляхта Беларусі, паводле Каліноўскага, магла і павінна была перашкаджаць гэтаму нацыянальнаму праекту. Так і было ў



N 1.

MUŻYCKAJA PRAUDA.

Dziecinki!

Minuło uże łoje. kali zdawało sia usim. szto mużyckaja ruka zdasce tolko da sachi.—ciepier nastau taki czas. szto my sami możem pisaci, i to pisaci takuju praudu sprawiedliwu jak Boh na niebi. O. zahremić nasza prauda i jak małanka pierelecić pa swieci! Niechaj paznajuć szto my możem nie tolko karmić swaim chlebom. no jeszcze i uczyć swajej mużyckoj praudy.

Pytali i pytajuć usie. szto czuwaci na swieci. chto nam biedym mużykam dašć wolnosć? No praudu skazauszy mało chto chocze skazaci tak jak sumlenie każe—pa sprawiedliwości. My mużyki. braty waszyje. my wam budziem hawaryć celuju praudu, tolko słuchajcie nas!

Maskali, czynouniki i mnoho panou. buduć pierepyniać pismo nasze da was; no najduć sia ludzie i z mużykou razumniejszyje i z panskaho rodu i z miasteczkowych. szto choczuć waszej swabody. waszaho szczaścia.—jony to wam sami heto pismo dawaci buduć. kab wy znali chto wasz pryjaciel. a chto wasz woroch.

Sześć let uże minuło jak pacząli hawaryć a swabodzie mużyckoj. Hawaryli, tałkawali i pisali mnoho. a niczoho nie zrabili. A hety manifest szto Car z Senatom i z panami dla nas napisau. to taki durny. szto czort wiedaje da czeho jon padobny.—nijakoj u nio·n niema praudy. niema z jeho dla nas nijakoj karyści. Parabili Kancelaryi. zrabili sud, jakby heto nie usio rouno brać u sraku czy z sudom, czy bez suda. Parabili Pisarou, Pasrednikou a usio za mużyckije hroszy i wielikije hroszy—czort ich wiedaje na szto; dla tobo chyba. kab zapisywali u księzki, jak mnoho napiszuć na srakach mużyckich. A z hetaho to i widać, szto nam niczoho dobraho i nie dumali zrabici.

Prauda, abieszczali to kaliś dać nam wolność: no jak nam zdajeć sia na nasz mużycki rozum, szto choczuć aszukaci. bo kali prez sześć let niczoho nie zrabili. to czerez rok peunie nie zrobiać. Mohuć jeszcze napisaci i druhi manifest, jeszcze bolszy ad hetaho, no i z hetaho druhoho manifestu niczoho dobraho jak i z pierszaho nie budzie.

Ad maskala i panou nie ma czeho spadziewaci sia; bo jony nie wolności a hłumu i zdzierstwa naszeho choczuć. No nie douho jony nas buduć abdziraci. bo my paznali hdzie siła i prauda i budziem wiedać jak rabić treba kab dastać ziemlu i swabodu. Waźmiem sia Dzieciuki za ruki i dziarżem sia razom! a kali pany schoczuć trymać z nami. tak niechaj że robiać pa świętej sprawiedliwości: bo kali inaczej—tak czort ich pabiery! Mużyk pakul zdużaje trymaci kosu i sakieru, baranić swaho patrapić i u nikoho łaski prasić nie budzie.

Hetu: Mużyckuju Praudu napisau i znou pisaci budzie Jaśko haspadar z pad Wilni

Kasztuje hroszy 5

«Мужыцкая праўда», № 1

сапраўднасьці. У 50–60-я гады XIX стагодзьдзя Дуніна-Марцінкевіча і яго аднадумцаў цкавалі арганізатары падпольных польскіх школаў.

Адсюль робіцца больш зразумелым і генэзіс назвы першай беларускай газэты — «Мужыцкая праўда». А таксама і асноўны канспіратыўны псэўданім Кастуся Каліноўскага — Хамовіч. Вядома, што польская і спольшчаная шляхта Беларусі ў XIX — пачатку XX стагодзьдзя называла хамамі беларускіх сялян.

Дарэчы, і сам Каліноўскі пакінуў нам сьведчаньне аб тых, хто адгукнуўся на палымяныя заклікі «Мужыцкай праўды». Ва ўласнаручнай тлумачальнай запісцы пасьля сьледзтва ён напі-

саў пра склад паўстанцкіх атрадаў на Горадзеншчыне ў часе, калі ён быў там камісарам:

> «Состав этих отрядов был большей частью из крестьян казенных, мелкопоместной шляхты и городских жителей, в которых шайки и находили самую сильную поддержку. На помещиков и их крестьян я получал постоянные жалобы от военных начальников…»

У арыентацыі на небагатыя пласты грамадзтва мы знаходзім эмацыйны матыў і прычыну ягонага радыкалізму адносна заможных землеўласьнікаў. Выступаючы супраць удзелу ў паўстаньні спольшчанай буйной шляхты і арыентуючыся на дробную шляхту і на сялян — ён бараніў свой «дарагі народ».

Важна зразумець — гэта быў ня толькі сацыяльны, але і нацыянальны праект. Ён хацеў забраць беларускую зямлю з рук палякаў і перадаць яе ў рукі беларусаў.

Нацыянальны дэмакратызм Каліноўскага

Ня менш важнай за сацыяльную справядлівасьць для Каліноўскага была справядлівасьць нацыянальная.

Вось яшчэ адзін штрых да гэтага. Калі падчас пакараньня на Лукіскім пляцы ў Вільні 22 сакавіка 1864 году быў зачытаны прысуд і Каліноўскага назвалі «дваранінам», ён выгукнуў: «У нас няма дваран; усе роўныя!»

Гэты факт пасьля ня раз камэнтаваўся і прысутнымі на пакараньні расейцамі, і гісторыкамі.

Камэнтатары лічылі Каліноўскага радыкальным сацыялістам, прыхільнікам роўнасьці і сусьветнай рэвалюцыі. Нацыянальнага аспэкту ў апошнім слове лідэра паўстаньня ніхто ня ўбачыў. Але ён там быў!

Гісторыя многіх славянскіх народаў падобная — практычна ўсе славяне, за выключэньнем палякаў і расейцаў, страцілі свае эліты. У чэхаў арыстакратыя і шляхта былі анямечаныя. І вось калі 28 кастрычніка 1918 году паўстала незалежная Чэхаславаччына, чэхі і славакі вырашылі забараніць шляхту, шляхецкія тытулы і згадкі пра іх. Гэта было зроблена ўжо праз паўтара месяца — 10 сьнежня 1918 году. Ад 1921 году выкарыстаньне шляхецкіх тытулаў і гербаў каралася як крымінальнае злачынства. У 1919 годзе была праведзеная зямельная рэформа, якая пазбавіла нямецкую шляхту зямлі і маёмасьці. Усе грамадзяне Чэхаславаччыны ад таго часу былі роўныя.

Гэта сацыялізм ці акт нацыянальнай справядлівасьці?

Безумоўна другое, і безумоўна гэта адпаведным чынам сьведчыць пра апошнюю заяву Кастуся Каліноўскага ў перадсьмяротную хвіліну на эшафоце. Ён ня здрадзіў сабе і тады. І тым больш каштоўным для нас гэты факт застаецца. Для Каліноўскага шляхты не было пастолькі, паколькі яна не была беларускаю.

Неўзабаве, усяго празь некалькі дзесяцігодзьдзяў, пазыцыя значнай часткі шляхты зьменіцца. Гэта адбудзецца дзякуючы дзейнасьці Каліноўскага і яго наступнікаў.

Нацыянальная ідэалёгія паўстаньня

Гісторыя пакінула дастаткова сьведчаньняў пра нацыянальную ідэалёгію братоў Каліноўскіх.

У 1850-я гады XIX стагодзьдзя ў Санкт-Пецярбургу склалася падпольная арганізацыя, якой кіравалі афіцэры Генэральнага штабу расейскай арміі Зыгмунт Серакоўскі і Яраслаў Дамброўскі, а таксама адна цывільная асоба — Віктар Каліноўскі. Старэйшы брат Кастуся адказваў за маладое папаўненьне арганізацыі.

Віктар быў блізка знаёмы са славутым расейскім гісторыкам Мікалаем Кастамаравым, які ў 1890 годзе расказаў пра знаёмства са старэйшым Каліноўскім у сваіх мэмуарах. Паводле Кастамарава, Віктар Каліноўскі шакаваў маладых палякаў, якія прыяжджалі ў Санкт-Пецярбург на вучобу, расказамі пра няпольскае мінулае ВКЛ:

> «Будучы знаёмы з гісторыяй сваёй бацькаўшчыны значна глыбей за тых верхаглядных патрыётаў, якія, не вывучаючы грунтоўна мінулага, складалі сабе пра яго летуценныя вобразы, Каліноўскі ў асяродзьдзі сваіх суайчыньнікаў выклікаў нават незадавальненьне за тое, што сьмела гаварыў рэчы, якія тагачасным польскім патрыётам былі не даспадобы».

Цалкам успрыняў сьветапогляд Віктара і яго малодшы брат.

Генадзь Кісялёў лічыў, што ў 1861–1862 годзе Кастусь Каліноўскі працаваў рэпэтытарам дзяцей Уладзіслава Сыракомлі, «вясковага лірніка». І вось яшчэ адзін факт, які тлумачыць нам на-



Уладзіслаў Сыракомля

цыянальную арыентацыю паўстаньня. Калі ў верасьні 1862 году Сыракомля памёр, яго труну несьлі і парадак у 10-тысячным натоўпе захоўвалі маладыя людзі, апранутыя ў тое, што жандары ў данясеньнях назвалі «серые кафтаны».

Гэта былі сялянскія сьвіткі, у якія пасьля апрануцца сотні агітатараў, што панясуць па вёсках «Мужыцкую праўду». Таксама ў сьвіткі апранутыя і многія паўстанцы, здымкі якіх да нас данесла гісторыя.

Кастусь Каліноўскі меў некалькі кансьпірацыйных псэўданімаў, сярод іх — Васіль Сьвітка. Нават у гэтым нельга не пачуць выклік польскім панам. А калі ня выклік, дык, прынамсі, нацыянальную адметнасьць і салідарнасьць з



Францішак Багушэвіч у сялянскай сьвітцы. 1863 год

носьбітамі і захавальнікамі нацыянальнай культуры — беларускімі сялянамі.

Актыўны ўдзельнік паўстаньня, найбліжэйшы паплечнік Каліноўскага, ураджэнец Віленскага павету лекар Баляслаў Длускі падчас навучаньня ў Маскоўскім унівэрсытэце ў другой палове 50-х гадоў XIX стагодзьдзя, паводле мэмуараў Якуба Гейштара, заўсёды быў апрануты

«у беларускую сьвітку шэрага простага сукна».



Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і яго дачка Каміла ў атачэньні будучых удзельнікаў паўстаньня. Менск, пачатак студзеня 1863 году. Частка герояў апранутыя ў сьвіткі і паўстанцкія сьвіткі – чамаркі. У сьвітку апрануты і Вітольд Парфяновіч (сядзіць чацьвёрты справа), які праз год ня вытрымае допытаў і выдасьць Кастуся Каліноўскага і паўстанцкі пароль

Уявіце сабе — Масква, унівэрсытэт, студэнты з расейскі дваран і польскай шляхты і раптам беларуская сялянская сьвітка з-пад Вільні!

А Длускі ж быў не юнак, ён скончыў унівэрсытэт у 45 гадоў. Упершыню ён быў высланы зь Беларусі яшчэ ў 1843 годзе за ўдзел у патрыятычным руху падчас навучаньня ў віленскай гімназіі. Быў аддадзены ў салдаты, асабістым геройствам падчас вайны на Каўказе даслужыўся да афіцэрскага чыну падпаручніка і дазволу на звальненьне і толькі пасьля гэтага паступіў ва ўнівэрсытэт.

Так што традыцыя апранацца ў сьвіткі была даўняя і чыста патрыятычная. Гэта была пазыцыя, якая праявіла сябе і падчас падзеяў 1863–1864 гадоў. Неафіцыйную форму ўдзель-

нікаў паўстаньня — чамаркі — таксама называлі паўстанцкімі сьвіткамі. Зрэшты, гэта і былі сьвіткі, толькі з нашытымі на грудзях шэрымі або чорнымі шнурамі. Сьвіткі XIX стагодзьдзя — гэта вышыванкі XXI стагодзьдзя.

Усё гэта сьведчыць, што ў паўстаньня была свая выразная нацыянальная ідэалёгія, выяўленая ў заявах лідэраў, друку, праклямацыях і масавых мастацкіх формах — напрыклад, у ваярскіх песьнях.


Вось яшчэ адзін яскравы прыклад. Падчас паўстаньня ў віленскага мешчаніна Пятра Мацкевіча, які тады жыў у Менску, быў канфіскаваны цэлы сшытак нелегальных тэкстаў.

У паўстанцкім гімне «Песьнь на Божы час», які выконваўся на матыў народнай песьні «І шуміць, і гудзе», сяляне, мяшчане і дробная шляхта сьпявалі:

> І хто пан — вон ад нас!
> Ў Божы час, ў Божы час!
> Бо мы роўныя з панамі,
> Бо за вольнасьць мы з касамі!

Відавочна, што і ў гэтым выпадку мы маем справу ня толькі з сацыяльнай, але і нацыянальнай эмансыпацыяй. Што пацьвярджае наступная страфа той самай песьні:

> Чуваць крык у адзін тон:
> Маскалёў ад нас вон!
> Бо як брытвы косы маем,
> Пагуляем, пагуляем!



PIESN NA BOŻYJ CZAS

248

nutoju: I szumić i hudzie.

Bożyj czas, bożyj czas,
Zawiernuu sia dla nas;
Mużyk wolno stau spiewaci,
Hodzi, hodzi prapadaci.

Hdzie nie hlań, hdzie nie stań,
Wałaczyć sia pahań.
Wyhanić nam jeju treba
Kab za toje dastać nieba.

Ej Maskal pchadzi!
Albo ... spadzi!
... tut nie wyminiesz,
Jak sabaka marnie zhiniesz!

I chto pan won ad nas!
U bożyj czas, u bożyj czas!
Bo my rounyje z panami,
Bo za wolność usie s kasami!

Друкаваная паўстанцкая ўлётка «Песьнь на Божы час»

Гэта — відавочнае выяўленьне ігнараванага дагэтуль нацыянальнага наратыву паўстаньня пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага: паны (палякі) і маскалі (расейцы) — прэч ад нас!

Сацыяльнае і нацыянальнае ішло ў паўстаньні побач. Дзьве страфы гэтай песьні, дзе згадваліся «маскалі», у СССР друкаваць было забаронена.

Дарэчы, мы дагэтуль цалкам не ўяўляем сабе сапраўдных маштабаў удзелу сялян у паўстаньні. Гэта зьвязана зь ціскам расейскай і савецкай цэнзуры на гісторыкаў за апошнія 150 гадоў. Але ня толькі.

Ужо ў часе паўстаньня расейскія ўлады хавалі ўдзел сялян у паўстаньні. Фальсыфікацыя адбылася ўжо ў 1863–1864 гадах. Захопленыя ў палон атрады паўстанцаў нярэдка дзялілі на шляхту і сялян. Апошніх раззбройвалі і пасьля некалькіх дзён утрыманьня пад вартай распускалі па дамах, і толькі пасьля гэтага перапісвалі шляхецкіх удзельнікаў і адпраўлялі данясеньні ў штабы і губэрнскія канцыляры для наступных судоў, высылак і пакараньняў. Сялян каралі толькі ў выпадку неабвержнай віны ў цяжкіх, з пункту гледжаньня ўладаў, злачынствах.

Падчас паўстаньня нярэдка здараліся выпадкі, калі сяляне выступалі на баку ўладаў і дапамагалі ім арыштоўваць паўстанцаў. Часьцей гэта здаралася на ўсходзе Беларусі. Некаторыя гісторыкі неапраўдана надаюць такім выпадкам характар міжканфэсійнага процістаяньня — маўляў, праваслаўныя сяляне ненавідзелі паноў-каталікаў.

Насамрэч, у гэтым праявіўся сацыяльны і нацыянальны антаганізм. Яшчэ ў 1846 годзе ў сувязі з хваляваньнямі ў Галіцыі віленскія ўлады даручылі губэрнскаму сакратару Адаму Кіркору таемную місію з мэтай ацаніць настроі сялян Заходняй Беларусі. У справаздачы Кіркор зрабіў выснову аб вялікай варожасьці сялян да землеўласьнікаў.

І ў часы паўстаньня сяляне востра адчувалі адчужанасьць паміж сабой і польскамоўнымі панамі. Гэтым таксама тлумачыцца нацыянальны і сацыяльна-палітычны выбар, зроблены Каліноўскім і яго паплечнікамі.



СВѢДѢНІЯ
о
ПОЛЬСКОМЪ МЯТЕЖѢ 1863
въ
СѢВЕРО-ЗАПАДНОЙ РОССІИ

СОБРАЛЪ ВАСИЛІЙ РАТЧЪ

ТОМЪ I

ВИЛЬНА
Въ Типографіи губернскаго правленія
1867

Хаваючы ўдзел сялян у паўстаньні, афіцыйныя расейскія гісторыкі адразу назвалі яго «польским мятежом»

Пра нацыянальную ідэалёгію паўстанцаў сьведчыць і такі адметны факт. Пасьля задушэньня паўстаньня, калі па ўсім краі адбываліся суды, сьмяротныя пакараньні і высылкі, паэт Вінцэсь Каратынскі напісаў своеасаблівы гімн беларускага выгнанца-катаржаніна «Туга на чужой старонцы». Музыку да яго стварыў высланы ў Сібір ў чэрвені 1864 году ўдзельнік паўстаньня, беларускі кампазытар Вінцэсь Клімовіч. Гімн



Высланы ў Сібір удзельнік паўстаньня, беларускі кампазытар Вінцэсь Клімовіч

быў вядомы і сярод сібірскіх выгнанцаў, і ў Беларусі. Нават у пачатку XX стагодзьдзя адзін зь яго экзэмпляраў трапіў у рэдакцыю «Нашай Нівы». Вось яго фрагмэнт:

Ой, саколка, ой, галубка!
Не пытайся, не, —
Што мне тошна, мая любка,
Ў гэтай старане...

Я ж зямліцу меў радную,
Быў свабодзен сам.
Ох, ці днюю, ці начую, —
Я ўсё там ды там!
Там гукнеш ў сардэчным краю —
Разьлягнецца сьвет.
Тут гукаю, прамаўляю —
Адгалоску нет...
Там, як птушка на свабодзе,
Я быў жыць прывык,
Не пытаўся: «Мала? Годзе?» —
Быў вясёл і дзік...
Паглядаю праз аконца —
Чоран цэлы сьвет;
Усім людзям сьвеціць сонца —
Мне прасьветку нет...

Нацыянальны аспэкт у абароне Уніі

І ў абароне Ўніяцкай царквы Каліноўскім несумненна быў нацыянальны аспэкт.

Па-першае, гэта было тактычна правільна, бо рана, нанесеная разгромам Уніяцкай царквы ў 1839 годзе, для шмат каго ў Беларусі была яшчэ сьвежай і балючай.

Па-другое, з пункту гледжаньня нацыянальнага праекту Каліноўскага, Унія стратэгічна ўмацоўвала асобнасьць беларусаў, узмацняла іх тоеснасьць і гарантавала ад асыміляцыі і расейцамі, і палякамі. «Пакуль я хрышчуся як праваслаўны, я не паляк, пакуль я памінаю папу

падчас літургіі, я не праваслаўны», — казалі тады ўніяцкія сьвятары.

З часу афіцыйнай забароны Ўніяцкай царквы на большай частцы тэрыторыі Беларусі прайшло толькі крыху болей за 20 гадоў. У часы паўстаньня ўніяцкаю заставалася Хэлмская япархія, якая ахоплівала сабой тэрыторыю Беласточчыны і заходняй Горадзеншчыны ўключна з Аўгустоўскім дэканатам. Гэтая япархія сілаю была пераведзена ў праваслаўе толькі ў 1874–1875 гадах. Уладам давялося выкарыстоўваць войскі супраць абаронцаў Уніі, падчас захопу цэркваў расейскімі салдатамі адбыліся масавыя расстрэлы сялян. Так што абарона Уніі паўстанцамі для часткі беларусаў наогул заставалася яшчэ востра актуальнай.

Але і на той тэрыторыі Беларусі, дзе Унія была скасаваная ў 1839 годзе, у 50-я і 60-я гады XIX стагодзьдзя яшчэ заставаліся цэнтры супраціву. Некаторыя вёскі адмаўляліся хадзіць у царкву. Шмат дзе нябожчыкаў хавалі безь сьвятара. Сумныя пахавальныя працэсіі без духоўнікаў у вёсках Беларусі ня раз апісваліся ў тагачасным расейскім друку. У многіх месцах дзейнічалі падпольныя ўніяцкія сьвятары. Вядомыя нават выпадкі высылкі ў Сібір беларускіх шляхцянак за дапамогу нелегальным уніяцкім духоўнікам напярэдадні і падчас паўстаньня.

У траўні 1864 году, ужо пасьля задушэньня паўстаньня, магілёўскі жандарскі штаб-афіцэр палкоўнік Бязяеў у адным са сваіх данясеньняў у Санкт-Пецярбург пісаў, што мясцовыя праваслаўныя сьвятары, якія перайшлі ў праваслаўе з

Уніі, маюць зусім невялікі ўплыў на распаўсюджаньне «действительного православия», бо ня ведаюць яго і ня хочуць ведаць. А мясцовая праваслаўная паства, паводле жандарскага палкоўніка, наогул яшчэ такой нават ня стала:

> «Народ, называющий себя русским и православным, не есть в точном смысле ни то ни другое, они не русские, потому что исторические и местные причины были для них другие..., не православные, потому что наружные религиозные знаки и поверья... здесь вследствие влияния польщизны во многом изменились».

А далей жандар расказвае, што мясцовыя праваслаўныя нярэдка ня ўмеюць жагнацца па-праваслаўнаму і жагнаюцца па-каталіцку. І гэта на ўсходзе Беларусі!

Менавіта памяць пра Унію і антыправаслаўныя настроі беларускіх сялян, а не жаданьне шляхецкіх рэвалюцыянэраў вярнуць народ у каталіцтва, спарадзілі заклікі да вяртаньня Ўніяцкай царквы ў паўстанцкай публіцыстыцы. Тады гэта быў дзейсны сродак агітацыі, і гэта разумелі нават польскія дзеячы паўстаньня, якім было мала клопату да нацыянальна-рэлігійных патрэбаў беларусаў.

Праціўнік Кастуся Каліноўскага, лідэр Беластоцкай паўстанцкай арганізацыі польскі рэвалюцыянэр Браніслаў Шварцэ, які добра валодаў сытуацыяй на месцах, у верасьні 1862 году ў лісьце да польскага эміграцкага дзеяча, генэрала Людвіка Мераслаўскага назваў адну зь меркаваных падставаў для посьпеху паўстаньня. Гэта



№ 6.

MUŽYCKAJA PRAUDA.

Dziaciuki!

Czy maja prauda horka, czy jona sałodka, ja pisau zausiudy i pisaci budu — uczyu ja was jak rabici treba i uczyci budu. Wy adno słuchajcie mienie, tałkujcie dobre i rabiecie tak jak sumlenie Wam skaże, a Boh jeszcze zlitujeć sia nad nami i daść nam szczaście i dabro u nas budzie.

Kali Boh stworyuszy czeławieka dau jemu duszu, to nie na toje kab jon żyu jak sabaka na hetom, a na tamtom świecie prapadau na wiek wiekou u rękach piekielnych, — a dla toho Dziaciuki kab znau zakon Boży, znau swaho Boha, znau swaju wieru i zasłużyu na szczaście niebiesnoje. Kali Syn Boski pryszouszy na hety świet ustanowiu praudziwuju wieru i za hetu wieru cierpieu kryżowyje męki, to nie dla toho, kab jakijeś tam Cary maskouskije, bajstruczaho rodu, pieremieniali zakon Boży, a my, na prykaz hetych Carou wyrekali sia wiery swaich Dziadou i Pradziedou i nie chwalili Boha, a radziu carskuju, — no dla toho Dziaciuki Boh Najwyższy cierpieu za nas, kab zakon Jeho byu uże wieczny, nichto nie smieu pieremieniaci, a my s całoj mocy trymali sia jeho.

No czy hetak Dziaciuki robić sia u nas jak sam Boh prykazywaje, — czy dzierżymo sia my zakonu boskaho? Sami skażecie. Nie adno uże może zabyu sia szto baćko jeho byu jeszcze sprawiedliwoj unijackoj wiery i nikoli uże nie spomnić na toje szto pierewierauli jeho na syzmu, na prawosławje, szto jon siehodnia, jak toj sabaka żywie bez wiery i jak sabaka zdochnie czartam da piekła!!! O, Dziaciuki, licho takomu czeławiekowi! A kali my budziem hetak rabici z Bohom, tak sztoż Boh najwyższy z nami zrobić? Addaść u Pieklo na wiecznyje męki, budeć czerty duszu naszu na kuski rwaci, a smała u wantrobach kipieci budzie. Paznajesz tahdy swaje licho — no u piekle pa niewczasie uże budzie, nie pieraprosisz tahdy uże sprawiedliwaho Boha i mękam twaim nikoli kańca niebudzie.

Ciepier pytaju Was Dziaciuki — chtoż nam heto licho narabiu i szto zrabici treba, kab my byli szczasliwyje i na hetom i na tamtom świecie?



...na Dziaciuki — heto Car maskouski ... zakupiuszy mnoho papou, wielu nas u syzmu zapisaci, jon to placiu hroszy kab my tolko pierechadzili na prawosławije i jak hety Antychryst, adabrau ad nas naszu sprawiedliwuju — unijackuju wieru i pahubiu nas pierad Bohom na wieki; a zrabiu heto dla toho, kab moh nas bez kańca draci, a Boh sprawiedliwy nie mieu zlitowania nad nami.

No Boże Wszechmocny, miłosierny ty nasz Panie. Ty ab nas nie zabywaj, zlituj sia nad nami, pamaży nam u naszej niedoli, wyżeni Maskala z naszaho kraju, daj nam praudziwuju wolność i wieru naszych Dziedou i Pradziedou — a kaścioły, szto Maskal, nieczysta jeho siła, paraskidau albo pierarabiu na stajni i cerkwi, znou zajaśniejuć Twajeju chwałoju i narod u nich chwalici Ciebie budzie, jak chwalili naszyje predki. Zaśpiewajem tahdy u adzin hołos naszu pieśń światuju: „Święty Boże, święty mocny, święty nieśmiertelny — zmiłuj się nad nami!" i Boh najwyższy zmiłujeć sia nad nami, dapamoże nam u naszej pracy, a na tamtom świecie dać królestwo niebiesnoje — i nie budeć uże dzietki naszyje swaju matku praklinaci szto na świet radziła!!

Pakazywajuć ludzie szto święty Ojciec aż z Rymu pryslau uże da nas swaje błahosławienie, (no Maskal jeho spyniaje) — haworać szto prysłe i ksiendzou, szto buduć prymaci na unijackuju wieru. Tahdy Dziaciuki chto adno wieryć u Boha, Jeho Syna i Ducha Światoho niechaj zaraz pakidaje syzmu i pierechodzić na praudziwuju wieru Dziedou i Pradziedou. Bo chto nie pierojdzie na unijackoj syzmatykom zastanieć sia, toj jak sabaka zdochnie, toj na tamtom świecie piekielnyje męki cierpieci budzie!

Tak hodzi uże Dziaciuki życi bez nijakoj paciechy na świecie kali Boh miłasierny maje zlitowanije nad nami, a ty czeławiecze, jak pieraczytajesz, albo paczujesz hetu praudu, zhawary paciery, kab Boh wszechmocny dapamoh ludziam, szto dobro nam dumajuć, szto chocznć, kab my byli wolnyje jak szlachta, mieli swaju ziemlu jak szlachta, chwalili Boha pa praudzie i zasłużyli na Nieba na tamtom świecie.

Hetaho dla Was ad duszy chocze, wasz brat, taki samy z Dziedou Pradziedou mużyk jak i Wy; no jeszcze Unijackoj wiery — Jaśko haspadar z pad Wilni.

Kasztuje hroszy 6.

†††

«Мужыцкая праўда», № 6

«гвалтоўны перавод пры Мікалаю І літоўскіх уніятаў у праваслаўных, рэлігійны рычаг на Літоўскай Русі можна выкарыстаць найбольш эфэктыўна, асабліва пры глыбокай нянавісьці да маскалёў».

Тут няма каталіцкага патрыятызму. Толькі цьвярозая канстатацыя факту. Вяртаньне Уніі ў Беларусі ўсё яшчэ было на парадку дня.

Удзел праваслаўных у паўстаньні

Паводле гісторыка Васіля Герасімчыка, царскім уладам удалося ўстанавіць веравызнаньне 116-ці ўдзельнікаў «польскай» рэвалюцыйнай

арганізацыі Серакоўскага-Дамброўскага-Каліноўскага (старэйшага) ў Санкт-Пецярбургу. Зь іх 40 чалавек былі праваслаўнымі.

У паўстаньні ўдзельнічалі тысячы праваслаўных беларусаў — сялян, гараджан і шляхціцаў. Існавала нават асобная праваслаўная паўстанцкая прысяга.


За ўдзел у паўстанцкіх атрадах было арыштавана 14 праваслаўных сьвятароў. Манахі праваслаўнага Жыровіцкага манастыра ў складзе атраду Валерыя Ўрублеўскага бралі ўдзел у славутай бітве пад Мілавідамі, якая скончылася адной з самых вядомых паўстанцкіх перамогаў над царскімі войскамі.

Праваслаўныя нароўні з каталікамі займалі паўстанцкія пасады. Паўстанцкім начальнікам Лідзкага павету, напрыклад, быў праваслаўны шляхціц Вітольд Гажыч.

Дастаткова зазірнуць у кнігі Генадзя Кісялёва і іншых беларускіх гісторыкаў паўстаньня, каб пераканацца, што гэта не адзінкавыя выпадкі, але масавая зьява.

Закідаць Каліноўскаму яго антыправаслаўную рыторыку — гэта значыць цалкам ня ведаць і не разумець гісторыі XIX стагодзьдзя і непрафэсійна пераносіць туды сёньняшнія ідэалягічныя схемы.

У той час абедзьве царквы не прызнавалі адна адну кананічнымі і ня мелі ніякіх афіцыйных зносін. Абедзьве лічылі, што вернікі супернай царквы не ўратуюцца і загінуць у пекле, таму іх трэба ратаваць. Пры пераходах з каталіцтва ў



Вайскова-судовая справа ўдзельніка паўстаньня, беларускага паэта Арцёма Вярыгі-Дарэўскага

праваслаўе і наадварот людзей наноў хрысьцілі і шчыра радаваліся чарговай уратаванай душы.

Здаралася, што праваслаўны мітрапаліт падчас падарожжа па заходняй частцы Расеі спыняўся і заходзіў паглядзець інтэр'ер правінцыйнага касьцёла. Такі выпадак адбыўся, напрыклад, у 1884 годзе, дзейныя асобы — праваслаўны Кіеўскі і Галіцкі мітрапаліт Платон і каталіцкі ксёндз Вінцэнт Маравіч. У выніку мітрапаліт быў пакараны ўсерасейскім астракізмам у прэсе, а ксяндза, які пусьціў праваслаўнага герарха за парог каталіцкай сьвятыні, забаранілі ў служэньні.

Гісторык, які сёньня бярэцца асуджаць Каліноўскага і яго паплечнікаў за іх пазыцыю ў рэлігійным пытаньні, парушае асноўныя мэтады гістарычнай навукі — гісторыка-генэтычны

і параўнаўчы. Такі гісторык таксама парушае асноўны прынцып аб'ектыўнага гістарычнага дасьледаваньня, сфармуляваны ў 2005 годзе вядучымі французскімі навукоўцамі ў адмысловай дэкларацыі ў адказ на ўхваленьне парлямэнтам Францыі рэкамэндацый для асьвятленьня французскага каляніялізму.

Гісторыкі заявілі, што ня хваляць і не асуджаюць мінулае, не трактуюць яго з пазыцый сёньняшніх прыярытэтаў і не пераносяць туды актуальныя ідэалягічныя схемы, а толькі стараюцца зразумець падзеі мінулага ў іх прычыннай сувязі і патлумачыць іх. У выніку спрэчны закон быў адкліканы.

Гісторыя — гэта навука, і праца гісторыка вымагае прафэсіяналізму, як любая іншая прафэсія.

II
ПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ

Процістаяньне з Варшавай

У паўстаньні 1863–1864 гадоў удзельнічалі тры партыі — «белыя», правыя «чырвоныя» і левыя (або радыкальныя) «чырвоныя». Першыя хацелі далучыць былое Вялікае Княства Літоўскае да Царства Польскага і дамагчыся яго аўтаноміі. Другія дамагаліся стварэньня незалежнай Польшчы ў межах Рэчы Паспалітай 1772 году. Трэція, да якіх належаў і Кастусь Каліноўскі, хацелі вырашыць сацыяльнае пытаньне і ў той або іншай форме аднавіць існаваньне гістарычнай Літвы.

Восеньню 1861 году ў Вільні для арганізацыі і кіраваньня будучым паўстаньнем быў створаны Камітэт руху, праз год пераутвораны ў Літоўскі правінцыйны камітэт, лідэрам якога стаў Кастусь Каліноўскі. У 1862 годзе ў Варшаве быў створаны Цэнтральны нацыянальны камітэт.

З гэтага часу пачынаецца процістаяньне Каліноўскага з Варшавай. Галоўнай прычынай процістаяньня і канфлікту была адмова Каліноўскага прызнаць вяршэнства Варшавы і яго патрабаваньне партнэрскай роўнасьці ў дачыненьнях. Другой прычынай канфлікту было жаданьне Каліноўскага не дапусьціць любой формы кантролю і юрысдыкцыі Варшавы над тэрыторыяй былога Вялікага Княства Літоўскага, уключна з Жамойцю і Інфлянтамі.

Польскі сучасьнік і гісторык паўстаньня 1863 году Валеры Пшыбароўскі пакінуў вымоўнае сьведчаньне пра той пэрыяд дзейнасьці Каліноўскага:

> «... Ён, уваходзячы ў Літоўскі камітэт, не хацеў прымаць ніякіх загадаў з Варшавы, а хацеў, каб гэты камітэт распараджаўся і кіраваў паўстаньнем самастойна і ў адносінах да Нацыянальнага ўраду займаў становішча ўлады роўнай і нікому не падначаленай».

З тэрытарыяльнай спрэчкі і ўзьнік першы сапраўдны канфлікт восеньню 1862 году.

Варшава, не параіўшыся зь Вільняй, падпарадкавала сабе беластоцкую паўстанцкую арганізацыю і пачала там зьбіраць рэвалюцыйны падатак. У лістападзе, падчас абмеркаваньня гэтага пытаньня на пасяджэньні Літоўскага правінцыйнага камітэту, раззлаваны Каліноўскі, прымяніўшы фізычную сілу, выкінуў з пакою камісара Цэнтральнага нацыянальнага камітэту ў Вільні Нэстара Дзюлерана.



Паплечнік Кастуся Каліноўскага лекар Баляслаў Длускі

У тым самым месяцы Каліноўскі паслаў у Варшаву спачатку Эдмунда Вярыгу, а пасьля Баляслава Длускага з патрабаваньнем вярнуць Беласточчыну Вільні, забараніць Варшаве дасылаць сваіх прадстаўнікоў у Літву, мець толькі па адным камісары ў абедзьвюх сталіцах, роўнасьці ў дачыненьнях і супольнага вызначэньня даты пачатку паўстаньня.

Варшава Беласточчыну вярнула, але роўнасьці не прызнала і паўстаньне пачала без узгадненьня зь Вільняй. Гэта адбылося ў ноч на 23 студзеня 1863 году.

22 студзеня Цэнтральны нацыянальны камітэт у Варшаве быў ператвораны ў Часовы нацыянальны ўрад і выдаў Маніфэст, якім пераняў уладу, скасаваў маскоўскія распараджэньні, абвясьціў усіх грамадзян такімі ж вольнымі, як «старапольская шляхта», і перадаў сялянам тую зямлю, якой яны карысталіся.

У Вільні пасьля некалькіх дзён разгубленасьці і спрэчак вырашылі далучыцца і надрукавалі кароценькую ўлётку з заклікам падтрымаць палякаў і фінальнымі словамі «Божа, збаў Польшчу», аўтарам якіх яўна быў не Каліноўскі.

Ён тады меў іншы клопат — у гарачых спрэчках з калегамі настойваў на ператварэньні Камітэту ва ўрад.

Стварэньне ўраду і яго разгром

1 лютага 1863 году, пасьля ўзгадненьня розных пазыцый у Вільні было абвешчана аб стварэньні Часовага правінцыйнага ўраду Літвы і Беларусі, які ў сваім маніфэсьце фактычна прадубляваў маніфэст варшаўскі. Урад узначаліў Кастусь Каліноўскі.

Сярод прынятых урадам дакумэнтаў зьвяртаюць на сябе ўвагу дзьве інструкцыі новым паўстанцкім уладам.

У першай гаварылася, што «ўсе паветы Літвы і Беларусі павінны выступіць і пачаць барацьбу», каб падтрымаць Польшчу, а восьмы пункт другой інструкцыі загадваў публічна караць сьмерцю «найбольш вядомых прыгняталькікаў сялян». Зноў мы разумеем, што за сацыяльным зьместам тут можа хавацца і нацыянальная пазыцыя — беларускіх сялян прыгнятаюць польскія паны. У этнічнай Літве восьмы пункт у інструкцыі адсутнічаў.

У Варшаве факт стварэньня ўраду Літвы і Беларусі выклікаў шок. Тое самае адбылося і зь віленскімі «белымі». Пасьля шэрагу захадаў, таемных перамоў і візытаў варшаўскі ўрад 27 лютага 1863 году выдаў пастанову аб роспуску Часовага ўраду Каліноўскага і аб стварэньні на яго месцы Аддзелу для кіраваньня правінцыямі Літвы. Каліноўскаму было загадана перадаць Аддзелу «пячатку, дакумэнты, перапіску і грошы».

Пастановы ўраду Літвы і Беларусі былі адмененыя, а яго членам было заяўлена, што ў выпадку непакоры іх імёны будуць абвешчаныя ў друку — інакш кажучы, выдадзеныя царскім уладам.

Як заўважыў гісторык Васіль Герасімчык, у пастанове Часовага нацыянальнага ўраду аб роспуску ўраду Літвы і Беларусі апошні па-ранейшаму называўся Літоўскім правінцыйным камітэтам. У Варшаве не жадалі нават заўважаць новых рэалій.

Каліноўскі напісаў пратэст на адрас Нацыянальнага ўраду ў Варшаве, у якім паведаміў, што вырашыў падпарадкавацца, бо

> «не адчувае сябе дастаткова моцным, каб вырваць кіраўніцтва спраў з рук сваіх праціўнікаў».

Тут ён выразна назваў варшаўскі ўрад і прыхільнікаў адзінай Польшчы сваімі праціўнікамі. Пры гэтым ён з прыкрасьцю ўбачыў, што віленскіх «белых» падтрымалі варшаўскія «чырвоныя», якія кіравалі Часовым нацыянальным урадам. Для яго гэта быў важны сыгнал і навука пра перавагу нацыянальных інтарэсаў над усімі астатнімі.

Сытуацыя стала б яшчэ больш зразумелаю, калі б Каліноўскі убачыў запіс, які расейскі пісьменьнік-эмігрант і рэвалюцыянэр Аляксандар Герцэн зрабіў у дзёньніку ў верасьні 1862 году пасьля перамоваў з варшаўскімі дзеячамі:

> «Мне ўсё здаецца, што ім да сялянскай зямлі, па сутнасьці, мала справы, а да правінцый — занадта многа».

Першы ўрад Літвы і Беларусі праіснаваў 27 дзён. Кожны зь іх для гісторыі быў неаспрэчным доказам нацыянальных прыярытэтаў і інтарэсаў Каліноўскага-палітыка.

Вымушаная паўза, але не адступленьне

У пачатку сакавіка Каліноўскі прымае ад «белых» прызначэньне на пасаду гарадзенскага вайсковага камісара і выяжджае ў Горадню, а затым у Беласток. У Беластоку ён выдае па-беларуску загад аб сваім заступленьні на пасаду.



Памятны камень на месцы бітвы пад Мілавідамі
на Берасьцейшчыне

Той дакумэнт пад назвай «Прыказ урадавага камісара ў Горадзенскім ваяводзтве» можна лічыць гістарычным. Гэта было ня што іншае, як вяртаньне беларускай мовы ў дзяржаўнае справаводзтва пасьля забароны, уведзенай у Рэчы Паспалітай у 1696 годзе. Ініцыятарам вяртаньня стаў Кастусь Каліноўскі.

Вайсковыя аддзелы паўстанцаў на Горадзеншчыне былі самымі арганізаванымі і баяздольнымі. Менавіта на Горадзеншчыне ў часы кіраваньня Каліноўскага адбылася славутая бітва пад Мілавідамі.

У выніку над існаваньнем беларусаў задумваюцца і ў Варшаве. Праз два месяцы, у дзень Канстытуцыі 3 траўня, варшаўскі ўрад выдае па-беларуску адозву, у якой заклікае «братоў-бе-

ларусаў» дапамагчы Польшчы і абяцае ім зямлю бяз паншчыны і чыншу. Гэтак у выніку дзейнасьці Каліноўскага і яго паплечнікаў беларусы набылі суб'ектнасьць у вачах Варшавы.

У траўні ў Вільню прыяжджае новы генэрал-губэрнатар Міхаіл Мураўёў, які тут жа распачынае тэрор і сэквэстры маёмасьці. «Белыя» пачынаюць разьбягацца, павятовыя і ваяводзкія начальнікі паляць паперы і закопваюць у зямлю пячаткі.

Дзяржаўны пераварот і аднаўленьне ўраду

У гэтых умовах у пачатку чэрвеня ў Вільню нечакана вяртаецца Кастусь Каліноўскі. Ён і яго найбліжэйшы паплечнік, паўстанцкі начальнік Вільні Ўладзіслаў Малахоўскі зьдзяйсьняюць захоп улады. Кіраўнік вайсковых спраў віленскіх паўстанцаў Юзаф Каліноўскі наступным чынам апісаў гэтую падзею ў сваіх мэмуарах:

> «Канстанцін Каліноўскі з тагачасным начальнікам гораду Ўладзіславам Малахоўскім зрабілі сапраўдны *coup d'état** і адважыліся стварыць уласнае ўпраўленьне».

Генадзь Кісялёў маляўніча апісаў, як Малахоўскі прыйшоў у кабінэт да лідэра Аддзелу для кіраваньня правінцыямі Літвы, прадстаўніка «белых» Якуба Гейштара і кінуў яму на стол выробленую на загад Каліноўскага пячатку бяз

* фр. дзяржаўны пераварот.



Член другога ўраду Каліноўскага
Ўладзіслаў Малахоўскі

польскага Арла — толькі з Пагоняй. Гейштар усё зразумеў і падаў у адстаўку.

Усё яшчэ пакуль «Аддзел для кіраваньня правінцыямі Літвы» ўзначаліў Каліноўскі. Таму выдадзены ім 11 чэрвеня па-беларуску славуты загад называўся «Прыказ ад Ронду Польскага над цэлым краем Літоўскім і Беларускім да народу зямлі Літоўскай і Беларускай».

Але пасьля дзяржаўнага перавароту, як пісаў ужо згаданы мэмуарыст, Кастусь Каліноўскі атрымаў правы сапраўднага дыктатара Літвы. З гэтай пазыцыі ён і пачаў свой апошні бой за бацькаўшчыну.

Варшава спрабуе ўскочыць у апошні вагон і дасылае ў Вільню новы загад аб стварэньні Выканаўчага аддзелу Літвы на чале з Каліноўскім. У дасланым праз некалькі дзён Статуце нарэшце прызнавалася роўнасьць Вільні і Варшавы.

Гэта была перамога Каліноўскага і яго паплечнікаў. Выканаўчы аддзел Літвы робіцца аналягам лютаўскага Часовага ўраду Літвы і Беларусі. Сучасьнікі назвалі яго «Чырвоным жондам», пад гэтай назвай ён і ўвайшоў у гісторыю. Сёньня мы можам гаварыць пра два ўрады Каліноўскага — першы і другі.

Вядома, Варшава прызнала толькі роўнасьць, а не незалежнасьць. Тэрытарыяльныя спрэчкі працягваліся яшчэ нават у жніўні. І мы ня ведаем, чым бы гэтая справа скончылася ў выпадку перамогі паўстаньня — фэдэрацыяй, канфэдэрацыяй ці поўнай незалежнасьцю Беларусі і Літвы. Але гэта ўсё роўна было прызнаньнем іх суб’ектнасьці.

Таямніца «Прыказу... да народу зямлі Літоўскай і Беларускай»

Сам «Прыказ» скіраваны на растлумачэньне народу задачаў паўстаньня. У ім Каліноўскі заклікае ня верыць расейскай прапагандзе, якая сьцьвярджала, што паны паўсталі, каб дамагчыся вяртаньня прыгону. Таксама «Прыказ» забараняе дапамагаць царскім войскам і загадвае не ствараць у вёсках сялянскай антыпаўстанцкай міліцыі.

Некаторыя асаблівасьці гэтага дакумэнту дазваляюць больш поўна зразумець нацыянальны сьветапогляд Каліноўскага.

Найперш гэта подпіс, які стаіць на друкаванай улётцы з гэтым «Прыказам»:

«Дан в месьці Вільні, у дзень Сьвятога Варфаломея лета Господня 1863».

Раней большасьць гісторыкаў датавала гэты «Прыказ» жніўнем 1863 году, бо менавіта 24 жніўня каталікі адзначаюць дзень сьвятога Барталамея. Аднак Генадзь Кісялёў знайшоў доказы распаўсюджваньня гэтага дакумэнту на Горадзеншчыне ўжо ў пачатку ліпеня 1863 году і пераканаўча даказаў, што мова ідзе пра дзень сьвятога Варфаламея, які паводле ўсходнехрысьціянскіх сьвяткаў (уніяцкіх і праваслаўных) адзначаўся 23 чэрвеня.

Гэта ўражвае. Паўстанцы адразу пасьля пачатку паўстаньня ўвялі датаваньне сваіх дакумэнтаў паводле Грыгарыянскага календара, каб падкрэсьліць асобнасьць ад Расеі, якая выкарыстоўвала Юліянскі каляндар. Але тут мова ідзе пра ўсходне- і заходнехрысьціянскія календары рэлігійных сьвятаў.

Наступная дэталь дакумэнту яшчэ больш неверагодная. Каліноўскі ў піша, што

«Гэты Прыказ мае быць чытаны ў кожнай цэркві да ў кожным касьцёле, па ўсіх сёлах і дворах для ведама ўсяго народу. А хто гэтаму Прыказу спрэчан будзе, таго — ці ён поп, ці ксёндз, мужык ці пан... зрабіўшы справядлівы суд, без адгаворкі

весьці на шыбеніцу! Бо хто хоча крыўды людзкой — той няхай лепш сам марна прападае!»

Такім чынам, Каліноўскі зьвяртаецца да ўсяго «народу зямлі Літоўскай і Беларускай» — і праваслаўных, і каталікаў — але пры гэтым пазначае ўсходнехрысьціянскую дату сьвята і называе яго патрона на ўсходні манер «Варфаламеем». Непахісная пасьлядоўнасьць і цьвёрдасьць гэтага юнака, у якога тры старэйшыя браты былі хрышчаныя ва Ўніяцкай царкве, уражвае.

Гэтак робіцца зразумелым яго нацыянальны і рэлігійны выбар. Да праваслаўных і каталікаў зьвяртаецца чалавек, які бачыць Унію стратэгічным выбарам беларускага народу. Улада адкрыта паказвае панам і мужыкам сваю пазыцыю ў рэлігійным і нацыянальным пытаньні.

Так мы яшчэ больш разумеем, кім быў Каліноўскі-палітык і з кім ён быў.

Апрача таго, «Прыказ» зьяўляецца другім выпадкам выкарыстаньня беларускай мовы ў афіцыйным дзяржаўным справаводзтве пасьля забароны 1696 году. Гэта — надзвычай важны крок і запавет Каліноўскага ў справе дзяржаўнай эмансыпацыі беларускай мовы.

Крок да незалежнасьці

Тым часам Каліноўскі ідзе далей. Ён замаўляе гравёру новую пячатку Выканаўчага аддзелу з надпісам «Літоўскі камітэт. Свабода. Роўнасьць. Незалежнасьць».

Слова «незалежнасьць» там прысутнічала невыпадкова. Сучасьнікі ў адзін голас сьведчылі, што з гэтага часу Кастусь Каліноўскі бярэ курс на здабыцьцё былым Вялікім Княствам Літоўскім незалежнасьці ад Польшчы.

У ліпені з Варшавы ў Вільню для перамоваў з Каліноўскім прыяжджае камісар Нацыянальнага ўраду Лявон Главацкі, які з жахам даведваецца, што Каліноўскі настойвае на адасабленьні былога Княства ад Польшчы.

20 ліпеня ў Вільню прыяжджае адзін з кіраўнікоў Нацыянальнага ўраду Оскар Авэйдэ, якому Каліноўскі падчас некалькіх шматгадзінных перамоваў цьвёрда заяўляе, што

> «Літва і Беларусь — зусім асобная і самастойная дзяржава».

Гэтую яго фармулёўку ў адзін голас прыводзяць і гісторыкі, і мэмуарысты.

І зноў тут трэба паўтарыць, што Літва і Беларусь ужо ўспрымаліся паўстанцамі дзьвюма краінамі, але яшчэ адзінаю дзяржавай. Каліноўскі і яго паплечнікі не ўяўлялі сабе мяжы там, дзе яе ніколі не было і дзе, паводле трапнага выразу Генадзя Кісялёва, пра яе ніколі не парупілася гісторыя. «Літва» ў шырокім сэнсе была для іх найбольш блізкім па часе гістарычным макратапонімам радзімы.

Для праціўнікаў Каліноўскага побач з макратапонімам «Літва» існаваў яшчэ супэртапонім «Польшча». Гэта адпавядае распрацаванай у XX стагодзьдзі тэорыі шматузроўневай нацыянальнай сьвядомасьці жыхароў былога ВКЛ.



Член другога ўраду Каліноўскага
Ціт Далеўскі

Паводле сьведчаньня Васіля Ратча, Авэйдэ так і ня змог угаварыць Каліноўскага адмовіцца ад сэпаратызму. 22 жніўня Авэйдэ быў арыштаваны, пасьпеўшы перад гэтым перадаць Каліноўскаму сваю пячатку і паўнамоцтвы камісара варшаўскага ўраду ў Літве і Беларусі. Гэтак Кастусь Каліноўскі засяродзіў у сваіх руках усю магчымую паўстанцкую юрысдыкцыю ў Літве і Беларусі.

З таго часу і да канца паўстаньня ён дзейнічаў як лідэр самастойнай дзяржавы Літвы і Беларусі — былога ВКЛ. Яго ўладу прызналі ўсе цывільныя і вайсковыя паўстанцкія адміністрацыі ў ваяводзтвах і паветах. Прымаючы яго прызначэньні на пасады, дзясяткі людзей, часта на дваццаць і болей гадоў старэйшыя за яго, ішлі

на верную сьмерць або катаргу — ва ўмовах паўсюднага тэрору і здрады іх арыштоўвалі ўжо праз тыдзень-два.

У сваіх паказаньнях сьледчай камісіі ўжо згаданы польскі афіцэр Юзаф Каліноўскі, які летам 1863 году быў блізкі да лідэра паўстаньня, расказаў пра амаль поўны разрыў Кастуся з Варшавай:

> «Отчужденность от Народного правительства, в которой находился уполномоченный комиссар Литвы в последнее время, самым гибельным образом отозвалась в крае».

Але Каліноўскі зусім не зьбіраўся прайграваць. У апошнія паўгода свайго жыцьця ён разьвіў вельмі актыўную дзейнасьць.

Каб актывізаваць паўстаньне, ён стварае палявую жандармэрыю і палявыя суды для пакараньня здраднікаў, замяняе паўстанцкіх камандзіраў. Пад канец году ён распускае касінераў па дамах на зімоўку і плянуе на вясну новае выступленьне.

Менавіта ў другой палове 1863 году Каліноўскі фармулюе сваё разуменьне будучыні Беларусі і беларускага народу, выкладзенае ім пасьля ў «Лістах з-пад шыбеніцы».

Ён таксама бачыць нацыянальныя патрэбы балцкага насельніцтва. У пачатку лістапада 1863 году ён прызначае этнічнага літоўца ксяндза Антанаса Мацкявічуса вайсковым кіраўніком Ковенскага ваяводзтва, але той неўзабаве гіне на шыбеніцы.

Каліноўскі па-ранейшаму спадзяваўся на сілу друкаванага слова і да самага арышту рыхтаваў



Член другога ўраду Каліноўскага Ігнат Здановіч

выданьне новага часопісу. Паводле Юзафа Каліноўскага,

> «печатное слово всегда было его слабостью, он приписывал ему какое-то особенное значение».

У новым часопісе Каліноўскі, які за апошні год, з увагі на ходу паўстаньня і пазыцыю Варшавы, перажыў істотную эвалюцыю, зьбіраўся, відавочна, сфармуляваць свае погляды на будучыню краіны і выкласьці іх папулярна. Арышт у ноч з 28 на 29 студзеня 1864 году перашкодзіў гэтаму.

Але нацыянальны запавет усё ж быў выкладзены ў турме на паперы і перададзены на волю ў выглядзе «Лістоў з-пад шыбеніцы», якіх, паводле сьведчаньняў сучасьнікаў, было больш чым тры — частка была канфіскаваная сьледчымі. Месца іх знаходжаньня да гэтага часу невядомае.

III
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЗАПАВЕТ

Першая палітычная суб'ектнасьць Беларусі

Трэба дакладна разумець, што пасьля адстаўкі Якуба Гейштара ў чэрвені сытуацыя фактычна, а пасьля і юрыдычна вярнулася да 1 лютага 1863 году. У выніку цяжкай барацьбы Кастусь Каліноўскі з паплечнікамі вырвалі ў Варшавы саступкі і другі раз на працягу 1863 году аднавілі суб'ектнасьць былога Вялікага Княства Літоўскага. А яно, у іх разуменьні, ужо складалася зь дзьвюх нацыянальных частак, якія пачыналі ўсьведамляць сябе палітычна — Літвы і Беларусі.

Гэта — першая палітычная суб'ектнасьць Беларусі ў гісторыі пад яе новай, мадэрнай назвай.

Першым урадам абвясьціў сябе Літоўскі правінцыйны камітэт, які складаўся з Кастуся Каліноўскага, Ахілеса Банольдзі, Эдмунда Вярыгі, Баляслава Длускага, Эразма Заблоцкага, Антона



Група ўдзельнікаў паўстаньня пасьля вяртаньня з Сібіры. Другі справа стаіць член другога ўраду Каліноўскага Фэлікс Зянковіч

Залескага, Яна Козела, Юрыя Кучэўскага-Порая, Баляслава Сволькена, Пятра Чакатоўскага і Зыгмунта Чаховіча.

У лютым справамі ў Вільні кіравалі Кастусь Каліноўскі і Зыгмунт Чаховіч, астатнія разьехаліся з даручэньнямі Каліноўскага або атрымалі прызначэньні ў паўстанцкія структуры на месцах.

Пасьля чэрвеньскага перавароту «Чырвоны жонд» у Вільні складаўся з Кастуся Каліноўскага, Ціта Далеўскага, Ігната Здановіча, Фэлікса Зянковіча, Мечыслава Дарманоўскага і Ўладзіслава Малахоўскага.



Член першага ўраду Каліноўскага Зыгмунт Чаховіч

Гэта людзі, якія ў тых складаных умовах здолелі кінуць выклік ня толькі Санкт-Пецярбургу, але і Варшаве.

Трое членаў першага ўраду Каліноўскага — Эдмунд Вярыга, Ян Козел і Зыгмунт Чаховіч — пасьля катаргі здолелі праз шмат гадоў вярнуцца ў Беларусь і ў канцы XIX — пачатку XX стагодзьдзя леглі ў родную зямлю. Пры гэтым Чаховіч пасьпеў стаць апекуном суседзкага юнака і выхаваць у яго асобе наступніка, а нам, будучым пакаленьням, нацыянальнага прарока — Янку Купалу.

Член другога ўраду Фэлікс Зянковіч, жывучы пасьля катаргі ў Варшаве, празь ліставаньне стаў апекуном беларускай паэткі другой паловы XIX стагодзьдзя Зоф'і Манькоўскай.

Нараджэньне краіны

У сярэдзіне XIX стагодзьдзя на сутыку эпох Рамантызму і Мадэрну па ўсёй Эўропе актывізаваліся нацыянальныя рухі. Працэс гэты ахапіў і славянскія народы.

Ва ўсходняй частцы Эўропы з апераджэньнем суседзяў актыўна фармавалася мадэрная польская нацыя, якая ў рамках пошуку гістарычных аргумэнтаў спрабавала ахапіць сабой усю тэрыторыю былой Рэчы Паспалітай. Аднак новай Польшчы не ўдалося тады цалкам усьвядоміць сябе ў межах Рэчы Паспалітай, бо гэтаму перашкодзіла дзейнасьць Каліноўскага і яго паплечнікаў.

Падзеі 1863–1864 гадоў прывялі да вычляненьня з агульнапольскага руху беларускага і літоўскага нацыяналізмаў. Прычым беларускі ўзьнік раней за літоўскі, але пасьля запаволіўся і адстаў ад апошняга з прычыны татальных рэпрэсій супраць сваіх носьбітаў — удзельнікаў паўстаньня. Да таго ж літоўцы мелі два важныя фактары нацыягенэзу, якіх у беларусаў не было — неславянская мова і прыналежнасьць да Каталіцкай царквы большасьці народу.

Таму варта паўтарыць яшчэ і яшчэ раз. 1 лютага 1863 году, у дзень стварэньня Часовага ўраду Літвы і Беларусі, узьнікла першая ў гісторыі палітычная суб'ектнасьць новай Беларусі. Старая Беларусь, што існавала раней пад назвамі і Русь, і Літва, пачала ўсьведамляць сябе новай мадэрнай Беларусьсю ў сваіх этнічных межах.



Ураджэнец Менску, паўстанцкі кіраўнік Магілёўшчыны, найбліжэйшы паплечнік Каліноўскага лекар Міхал Аскерка

Гэта адбылося менавіта ў 1863–1864 гадах, прычым раней, чым гэта ўбачылі і зразумелі ў Расеі. Там яшчэ ў другой палове 60-х гадоў XIX стагодзьдзя ў прывітальным вершы Мураўёву-вешальніку паэт Мікалай Някрасаў пісаў:

Мятеж прошёл, крамола ляжет,
В Литве и Жмуди мир взойдёт;
Тогда и самый враг твой скажет:
Велик твой подвиг... и вздохнёт.

Але самі ўдзельнікі «мятежа» ўжо назвалі сваю краіну Беларусьсю і нават пасьпелі ў паўстанцкім паролі прызнацца ёй у любові.

Гэта праўда, што Кастусь Каліноўскі і большасьць яго паплечнікаў паходзілі з заходняй часткі Беларусі — зь Віленшчыны, Беласточчыны і Горадзеншчыны. Але прысутнасьць у шэрагах яго аднадумцаў Станіслава Сангіна з Гомельшчыны, Пятра Чакатоўскага і Цэлястына Цеханоўскага з Магілёўшчыны, Арцёма Вярыгі-Дарэўскага і Марцэля Карафы-Корбута зь Віцебшчыны, Уладзіслава Малахоўскага і Францішка Юндзіла зь Берасьцейшчыны, ня кажучы ўжо пра шматлікіх ураджэнцаў Меншчыны, паказвае, што мы маем справу з завяршальным этапам нацыянальнай кансалідацыі. Яна, як і ў іншых народаў, адбываецца найперш сярод актыўнай часткі грамадзтва.

У першай палове — сярэдзіне XIX стагодзьдзя галоўнымі прапагандыстамі назвы «Беларусь» сапраўды былі ўраджэнцы Вільні, Беласточчыны і Горадзеншчыны. Але працэс нацыянальнага ўсьведамленьня праходзіў на ўсёй тэрыторыі краіны. Калі будучыя ўніяцкія прафэсары зь Беласточчыны (Міхал Баброўскі, Ігнат Даніловіч, Язэп Ярашэвіч і інш.), якіх называюць пачынальнікамі беларускай ідэі, у 10-я гады XIX стагодзьдзя паступілі ў Віленскі ўнівэрсытэт, там ужо існаваў уніяцкі беларускі гурток, створаны Антонам Марціноўскім, сынам уніяцкага сьвятара зь Меншчыны.

Нішто не зьяўляецца зь ніадкуль. Сучасныя межы Рэспублікі Беларусь, уключна з дыялектна спэцыфічнай Берасьцейшчынай (Уладзіслаў Малахоўскі паходзіў з Кобрыну), акрэсьліліся менавіта ў часы Каліноўскага.

І менавіта тады на сьвет зьявілася мадэрная краіна Беларусь у сваіх геаграфічных і этнічных межах, якім яшчэ толькі належала ў будучыні стаць дзяржаўнымі.

Маці Беларусі — шляхта

Цяжка пагадзіцца з тымі гісторыкамі, якія сьцьвярджаюць, што пераважная большасьць шляхты Беларусі ўжо ў XVIII стагодзьдзі цалкам успрыняла літоўскі этнагенэтычны міт пра сваё паходжаньне ад рымлян і цалкам зраклася «рускай» мовы і русінскай сьвядомасьці.

У Беларусі і ў XVIII стагодзьдзі, і ў пачатку XIX стагодзьдзя заставалася яшчэ праваслаўная шляхта, было нямала ўніяцкай і беднай каталіцкай шляхты. Траплялісі нават зямяне, а на поўначы Віцебшчыны аж да пачатку XIX стагодзьдзя захоўваліся памежныя паселішчы панцырных баяраў. Усе яны карысталіся беларускай мовай у побыце і памяталі пра сваё «рускае» паходжаньне, як пра яго яшчэ ў пачатку XVII стагодзьдзя сказаў Мялеці Сматрыцкі:

> «Ня вера русіна русінам, паляка палякам, літоўца літоўцам робіць, але нараджэньне і кроў руская, польская і літоўская».

Ня ўся і буйная шляхта цалкам забылася на сваю «рускасьць». Беларускамоўная паэзія XVIII стагодзьдзя шляхецкага паэта Дамініка Рудніцкага або апошняга канцлера Вялікага Княства

Літоўскага, магната Яўхіма Храптовіча гэтаму пацьверджаньне.

Дзясяткі беларускіх пісьменьнікаў першай паловы XIX стагодзьдзя — гэты час называюць пэрыядам літаратурнага абуджэньня Беларусі — паходзілі са шляхты, і толькі адзінкі — Паўлюк Багрым, Вінцэсь Каратынскі — зь сялян. Ды яшчэ Ян Баршчэўскі быў сынам уніяцкага сьвятара.

Менавіта дзякуючы шляхце на сьвет зьявілася новая Беларусь. І менавіта пад кіраўніцтвам шляхты наш народ прайшоў няпростую дарогу ад Русі празь Літву і часткова Польшчу да Беларусі.

Нярэдка кажуць, што «беларусы» і «Беларусь» — не саманазвы народу і краіны. Гісторыя, аднак, сьведчыць пра адваротнае. Менавіта гэтую назву ў XIX стагодзьдзі выбралі самі віленскія і наогул заходнебеларускія ліцьвіны і русіны, калі вырашылі выразна адрозьніць сябе ад балцкага насельніцтва гістарычнай Літвы на падставе сваёй (або сваіх продкаў) «рускай» мовы.

Калі б не распаўсюджанасьць польскай мовы сярод эліты тагачаснага грамадзтва — нашым нацыянальным назовам мог стаць этнонім і палітонім «ліцьвіны». Але для польскамоўных пачынальнікаў беларускай ідэі ў XIX стагодзьдзі слова «ліцьвін» (Litwin) было сынонімам сёньняшняга слова «літовец» (балт, lietuvis). Пачынальнікі адчувалі патрэбу самаідэнтыфікавацца, аддзяліць сябе ад балтаў. Таму выбар быў зроблены на карысьць «Беларусі» і «беларусаў».

Ужо ў сярэдзіне 30-х гадоў XIX стагодзьдзя студэнт Мэдыка-хірургічнай акадэміі ў Вільні,

беларускі паэт і рэвалюцыянэр Францішак Савіч у вершы «Дзе ж тое шчасьце падзелася» ад імя беларусаў усклікне:

Ліцьвін, валынец, падайце ж мне рукі,
Так — прысягаем на Госпада-Бога,
Царам — на згубу, панам — для навукі,
Што на той зямлі не паўстане і нога —
Ані гэта паганска, ані гэта тыранска...

І сама выбраная назва — беларусы — таксама тлумачыцца польскамоўнасьцю тых, хто выбіраў. Для іх гэта была важная гістарычная пераемнасьць. Па-польку русіны — Rusini, а беларусы — Białorusini.

Гэты выбар зрабіла пераважна ўжо польскамоўная шляхта і, у меншай ступені, прадстаўнікі ўніяцкіх і праваслаўных адукаваных колаў. Гэтыя людзі сябе амаль не перайменоўвалі — былі русіны, сталі — «беларусіны».

Добра гэта ці дрэнна — абмяркоўваць ня мае сэнсу. У момант зараджэньня нацыі яе заснавальнікі далі ёй такую назву. І сёньня гэта ўжо ня зьменіш.

Складанасьць гэтага пошуку ідэнтычнасьці і назвы ілюструюць дзьве цытаты. У пачатку 40-х гадоў XIX стагодзьдзя Адам Міцкевіч падчас лекцый казаў студэнтам:

«Гаворкаю **Белай Русі**, званаю **русінскай** ці **літоўска-русінскай**... размаўляе каля 10 мільёнаў чалавек: гэта гаворка найбагацейшая і найчысьцейшая; яна распрацоўвалася з даўніх

часоў: вялікія князі літоўскія карысталіся ёю ў дыпляматычным ліставаньні ў пару незалежнасьці Літоўскага княства».

Празь дзесяць гадоў — у 1853 годзе — сябар і паплечнік Адама Міцкевіча Аляксандар Рыпінскі ў прадмове да выдадзенай ім беларускай баляды «Нячысьцік» пісаў:

«Просты народ на Беларусі і амаль што ва ўсёй Літве, там, дзе селянін не па-літоўску, але **па-руску** гаворыць, сьпявае на сваёй мове нейкую сьмешную песьню пра дзіўнага ілгуна Мікіту...»

Як бачым, Рыпінскі, выдаючы ўласны паэтычны твор на беларускай мове, усё яшчэ вагаўся з назвай мовы, на якой пісаў.

Але аўтары абедзьвюх цытатаў былі далёка ад Беларусі. Міцкевіч сказаў гэта ў Парыжы, Рыпінскі — у Лёндане. У самой Беларусі ў пачатку 60-х гадоў XIX стагодзьдзя справа з назвай мовы, народу і краіны была ўжо вырашана канчаткова.

У гэтага выбару былі добры і дрэнны бакі. Новая назва захавала гістарычную пераемнасьць і справядлівасьць — Русь значна старэйшая за Літву. Разам з тым, вылучэньне Беларусі і беларусаў з гістарычнай Літвы як бы пазбавіла іх фармальнага права на спадчыну Вялікага Княства Літоўскага. Таму для беларускай нацыянальнай ідэі заўсёды важным застаецца фактар гістарычнай адукацыі. Кожны школьнік павінен ведаць, што ВКЛ — адна з апораў беларускай дзяржаўнасьці і культуры, але не адзіная — да яе былі Полацкая дзяржава, Тураўскае княства і сярэднявечны Наваградадак.



Удзельнік паўстаньня 1830–1831 гадоў, беларускі паэт Аляксандар Рыпінскі (крайні зьлева) сярод курсантаў Дынабурскай школы падхарунжых

Вядома, ня ўся шляхта тады і пазьней зрабіла выбар на карысьць беларускай нацыянальнасьці і Беларусі. Шмат хто выбраў Польшчу. Часам гэты падзел праходзіў паміж членамі адной сям'і або паміж пакаленьнямі.

Але перадавая частка шляхты, якая захоўвала гістарычную памяць і адчувала сувязь з народам, выбрала Беларусь.



Дэпутат I Дзяржаўнай думы Расеі, прэм'ер-міністар БНР Раман Скірмунт

Лідэрам і выказьнікам пазыцый перадавой часткі шляхты быў Кастусь Каліноўскі са сваімі паплечнікамі.

Усяго праз паўстагодзьдзя, увесну 1917 году, у Расейскай імпэрыі праводзіўся перапіс уладальнікаў сельскіх гаспадарак, падчас якога ўпершыню ў гісторыі задавалася пытаньне пра нацыянальнасьць. І вось тады ўжо практычна ўсе сяляне і пераважная большасьць шляхты і арыстакратаў Меншчыны назвалі сябе беларусамі. Сярод іх былі і Друцкія-Любецкія, і Гутэн-Чапскія, і Скірмунты, і Радзівілы, і Любанскія, і Ваньковічы, і многія, многія іншыя.

Калі б не бальшавіцкі пераварот кастрычніка 1917 году, Беларусь магла быць зусім іншаю.

Нацыянальны маніфэст Каліноўскага

Кастусь Каліноўскі пакінуў даволі вялікую спадчыну. Цяжка пераацаніць значэньне першай беларускай газэты «Мужыцкая праўда». Толькі за яе чытаньне і распаўсюджваньне было пакарана сьмерцю або высылкай мноства беларускіх патрыётаў.


Афіцэраў царскай арміі, беларусаў з паходжаньня, за чытаньне «Мужыцкай праўды» салдатам расстрэльвалі. Так у чэрвені 1863 году каля брамы менскага Пішчалаўскага замку быў расстраляны Міхал Цюндзявіцкі з Барысаўскага павету.

Але па-над усім у спадчыне Каліноўскага стаяць ягоныя «Лісты з-пад шыбеніцы», якія ў арыгінале называліся «Да беларускага народу». Вось да каго ён зьвярнуўся перад сьмерцю! Да свайго народу і каханай дзяўчыны.

Ужо ў самым пачатку першага ліста, які Каліноўскі даслаў з турмы ў газэту «Głos z Litwy» як артыкул, ён адмяжоўваецца ад расейцаў і ад палякаў:

> «... Пісьмо аддрукуйце, каб знаў сьвет Божы, як мужыкі Беларусы глядзяць на маскалёў і паўстаньне польскае...»

У гэтай і наступных частках «Лістоў з-пад шыбеніцы» ён працягвае выкарыстоўваць уведзенае ім у ранейшай публіцыстыцы паняцьце народнай (мужыцкай) праўды — праўды беларусаў або беларускай праўды:


58

Braty maje, mužyki rodnyje.
Z pad szubienicy maskouskoj
pryjchodzić mnie da was pisać,
i može raz astatni. Horko
pakinuć ziemielku rodnuju
i Ciebie, darahi moj narodzie.
Hrudzi zastohnuć, zabolić
serce, – no nie žal zhinuć za
twaju praudu.–

Першая старонка трэцяй часткі «Лістоў з-пад шыбеніцы»

«...Ты, народзе вялікі і чэсны, праўдай ім [замежным народам] адкажы».

«Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці...»

«...Но ня жаль згінуць за тваю праўду».

Беларуская праўда (ідэя, рацыя, права, справядлівасьць) выступае ў «Лістах» пад трыма фармулёўкамі — «праўда», «твая праўда», «наша праўда». Пара прыналежных займеньнікаў «твая-наша» паказвае, што Каліноўскі назаўсёды залучыў сябе да ліку беларусаў, ад імя якіх і да якіх ён піша лісты.

Пасьля гэтага маніфэсту абвясьціць Каліноўскага некім іншым проста немагчыма. Гэта поўнае нацыянальнае ўсьведамленьне і атаясам-

леньне сябе зь беларускім народам. Ён піша ад імя мужыка-беларуса і на ягонай мове — па-беларуску.

А там, дзе жывуць беларусы і дзе гавораць па-беларуску — там і любімая Беларусь з паўстанцкага паролю. Па-беларуску гавораць і ў родных для Каліноўскага Мастаўлянах на Беласточчыне, і за Магілёвам. Значыць, гэта ўсё Беларусь.

Гэты запавет Каліноўскага праз 27 гадоў прамовіць удзельнік паўстаньня Францішак Багушэвіч:

> «Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак».

«Лісты з-пад шыбеніцы» — гэта нацыянальна-палітычны маніфэст і асабісты запавет Каліноўскага будучым пакаленьням. Там утрымліваюцца геапалітычныя, эканамічныя і культурна-адукацыйныя пастуляты, выкананьне якіх мае захаваць беларускі народ ад гістарычнай сьмерці.

Гэта — вяршыня і фінальны пункт нацыянальнай эвалюцыі не да канца спольшчанага беларускага шляхціца, ліцьвіна-русіна з былога Вялікага Княства Літоўскага.

За яго прыкладам пойдуць многія ўжо ў XIX стагодзьдзі, а ў пачатку XX стагодзьдзя, як мы цяпер ведаем, сярэдняя і буйная шляхта Беларусі пачне ўжо масава называцца беларусамі.

Водгук у сэрцах эліты

Прамысловая рэвалюцыя XIX стагодзьдзя амаль не закранула Беларусь, якую ўлады Расеі зрабілі сваёй аграрнай ускраінай. Таму паўстанцы мелі мала апоры ў пераважна габрэйскіх гарадах і зьвярталіся да сельскага насельніцтва — шляхты і сялян. А Каліноўскі, у дзейнасьці якога быў і нацыянальны аспэкт, — толькі да сялян і дробнай шляхты як носьбітаў беларускай мовы і культуры. У паўстаньні прымалі ўдзел і рамесьнікі, але іх было няшмат.

Адпаведна і беларускі нацыяналізм пачатку XX стагодзьдзя амаль не заўважыў звароту да беларушчыны часткі арыстакратаў і шляхты. Ён шукаў апору ў сялянскіх масах і менавіта таму заразіўся сацыялістычнымі ідэямі, якія ішлі з Санкт-Пецярбургу. Гэта пайшло на шкоду нацыянальнай ідэі, выклікала разлад і падзел элітаў, а ў канечным выніку прывяло да аслабленьня руху і адштурхоўваньня арыстакратыі.

Гэты падзел паспрабаваў у 1918 годзе ліквідаваць прэм’ер-міністар Беларускай Народнай Рэспублікі магнат Раман Скірмунт. Ён прывёў у Раду БНР князя Гераніма Друцкага-Любецкага і прыцягнуў да дыпляматычнай дзейнасьці рэспублікі князя Альбрэхта Антонія Радзівіла, графа Юрыя Гутэн-Чапскага, магната Аляксандра Любанскага і іншых прадстаўнікоў арыстакратыі. Але было ўжо позна, геапалітычная сытуацыя разгортвалася не на карысьць БНР.



Прамы нашчадак Рурыка і Рагвалода, дэпутат І Дзяржаўнай думы Расеі, член Рады БНР князь Геранім Друцкі-Любецкі

Буйны землеўласьнік Менскай губэрні Эдвард Вайніловіч, у доме якога праходзіў Беларускі зьезд Случчыны, што ўзьняў Слуцкае паўстаньне, пісаў у сваіх успамінах:

«З усіх беларускіх суполак, прымаючы ў іх удзел матэрыяльна, я ў рэшце рэшт сыходзіў, таму што іх дзейнасьць, якая пачыналася з самапазнаньня і нацыянальнага адраджэньня («Лучынка», «Саха», «Загляне сонца і ў наша ваконца» і т. д.) звычайна ў канцы набывала сацыялістычны кірунак, які супярэчыў усім маім перакананьням і зь якім я ня мог пагадзіцца».

Зь іншага боку, можна канстатаваць, што рэальны ўплыў нацыянальна-палітычнай рыторыкі Каліноўскага на розумы беларускай эліты меў далёкасяжныя наступствы і выявіўся амаль імгненна. Усяго праз некалькі гадоў яго падха-


пілі юнакі, якім падчас паўстаньня было 13–15 гадоў.

Ужо ў 1868 годзе ў Санкт-Пецярбургу ўзьнік «Крывіцкі вязок» — культурна-асьветная арганізацыя беларускай арыстакратычнай моладзі. Паводле сьведчаньня аднаго зь яе ўдзельнікаў, графа Вайніслава Савіч-Заблоцкага, у «Вязок» увайшлі да пяцідзесяці князёў, графаў, сыноў камэргераў імпэратарскага двара і генэралаў. Прычым, як пісаў Савіч-Заблоцкі, сярод удзельнікаў арганізацыі былі ня толькі беларусы, але таксама палякі і расейцы, якія спачувалі беларускай ідэі.

Члены «Вязка» вывучылі беларускую мову, пачалі складаць слоўнік і зьбіраць фальклёр, унесьлі ў агульную скарбонку па 100 рублёў, утварыўшы такім чынам, выдавецкі фонд. У выдавецкім пляне значыліся беларускія лемантары, календары, падручнікі, праваслаўныя і каталіцкія малітоўнікі, кнігі па заалёгіі і гігіене, а таксама папулярная літаратура, у тым ліку байкі Эзопа і зборнікі прымавак і прыказак.

«Вязок» быў разгромлены ў 1870 годзе — адны яго члены былі ўзятыя пад нагляд паліцыі, іншыя высланыя дадому пад хатні арышт, нехта трапіў на лячэньне за мяжу або быў узяты на казённую службу.

Сам малады граф, ураджэнец Віленшчыны Вайніслаў Суліма-Савіч-Заблоцкі быў высланы ў Варшаву, адкуль праз тры гады эміграваў за мяжу. Ён жыў у некалькіх эўрапейскіх сталіцах, блізка кантактаваў з нацыянальным героем Італіі Джузэпэ Гарыбальдзі.



МИНИСТЕРСТВО ЗЕМЛЕДѢЛІЯ.
Статистическій Отдѣлъ
Минской губ. Земской Управы.


Всероссійская Сельско-хозяйственная и поземельная перепись 1917 г.

КАРТОЧКА ДЛЯ СПЛОШНОЙ ПЕРЕПИСИ СЕЛЬСКИХЪ ХОЗЯЙСТВЪ.

Форма № 1.

Губернія Минская, уѣздъ Минскій волость Заславская
Общество Старорак... деревня, имѣніе или (точно указать) Шаповалы
Фамилія, имя и отч. домохозяина (учрежденіе или предпріятіе) Кн. Друцко-Любецкій Ераним №
Сословіе его двор. національность бѣлор.
Хозяйство: приписное или постороннее—(къ сельск. общ.); бѣженецъ (подчеркнуть)
Подчеркнуть: хозяйство отсутствующее; хозяйство частновладѣльческое.
Близъ какого селенія расположено владѣніе, разстояніе д. Венделово 1½ в.
Мѣсто сбыта продуктовъ, разстояніе м. Раковъ 12 верст

Перапісная картка князя Гераніма Друцкага-Любецкага, дзе ён пазначае сваю нацыянальнасьць як беларускую. 1917 год



МИНИСТЕРСТВО ЗЕМЛЕДѢЛІЯ.
Статистическій Отдѣлъ
Минской губ. Земской Управы.

Всероссійская Сельско-хозяйственная и поземельная перепись 1917 г.

КАРТОЧКА ДЛЯ СПЛОШНОЙ ПЕРЕПИСИ СЕЛЬСКИХЪ ХОЗЯЙСТВЪ.

Форма № 1.

Губернія Минская, уѣздъ Минскій волость Станьковская
Общество Житомирское деревня, имѣніе или (точно указать) Скориничи
Фамилія, имя и отч. домохозяина (учрежденіе или предпріятіе) граф Гутен-Чапскій Георгій Эмер. № 1
Сословіе его двор. національность бѣл.
Хозяйство: приписное или постороннее—(къ сельск. общ.); бѣженецъ (подчеркнуть)
Подчеркнуть: хозяйство отсутствующее; хозяйство частновладѣльческое.
Къ владѣльческому и хуторскому хозяйствамъ.
Близъ какого селенія расположено владѣніе, разстояніе
Мѣсто сбыта продуктовъ, разстояніе
Если карточка составлена на арендатора, то фамилія, имя, отч. и сословіе владѣльца земли
Имѣется ли у даннаго владѣльца земля еще въ другомъ мѣстѣ и гдѣ именно?
Имеются им. в Самохв. Дудичской и Станьк. волостях

Перапісная картка графа Юрыя Гутэн-Чапскага, дзе ён пазначае сваю нацыянальнасьць як беларускую. 1917 год

У 1886 годзе ў беларускамоўным лісьце з Парыжу ў Жэнэву да ўкраінскага дзеяча Міхайлы Драгаманава беларускі граф назваў сярод сваіх папярэднікаў Кастуся Каліноўскага і напісаў:

«А збожжа ж усё-такі і ў нас расьце, кроў і ў нашых краўніцах цячэ! Беларусь мая будзе!»

Неўзабаве, у 1906 годзе, у складзе I Дзяржаўнай думы Расеі ўзьнікне беларуская дэпутацкая група, у якую ўвойдуць і арыстакраты, і шляхта, і каталіцкія біскупы, якія пачнуць палітычную барацьбу за аўтаномію і самакіраваньне Беларусі. Сярод іх будуць прамы нашчадак Рурыка і Рагвалода князь Геранім Друцкі-Любецкі, магнат Раман Скірмунт, біскуп Эдвард фон Роп. У 1918 годзе іх барацьба, як ужо і многіх, многіх іншых, скончыцца абвяшчэньнем незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

У пачатку ўсяго гэтага палітычнага працэсу стаіць дзейнасьць Кастуся Каліноўскага, у тым ліку два ягоныя ўрады 1863 году.

Палітычны запавет

У «Лістах з-пад шыбеніцы» ўтрымліваюцца яшчэ не сыстэмна сфармуляваныя, але ўжо дакладна акрэсьленыя пастуляты беларускай нацыянальнай ідэі. Іх дзесяць. І ўсе яны дагэтуль актуальныя:

1. Самы галоўны зь іх: Мы — беларусы. Гэта слуп, на якім стаіць Беларусь. Каліноўскі цалкам атаясамлівае сябе зь беларускім народам,

фактычна, называе сябе беларусам і сьцьвярджае суб'ектнасьць беларускага народу:

«...Каб знаў сьвет Божы, як мужыкі ***Беларусы*** глядзяць на маскалёў і паўстаньне польскае».

«...Енарал Касьцюшка, што то, кажуць, каля Слоніма радзіўся і а каторым ***народ наш*** сьпявае».

«...***Нам*** пад рондам польскім не заўсім было добра».

2. Каліноўскі называе першаступеннай каштоўнасьцю сувэрэнітэт народу:

«Калі ронд польскі ўсім братнім народам дае ***самарондства***, маскаль... гэтак ня робіць».

3. У некалькіх месцах Каліноўскі называе вялікай каштоўнасьцю патрыятызм. Вось адно зь іх:

«...Ты, аднак, народзе, не дажыдайся, да з чым можаш ідзі ваяваці ***за свайго Бога, за сваё права, за сваю хвалу, за сваю бацькаўшчызну***».

4. Каліноўскі ставіць пытаньне пра сацыяльную справядлівасьць у будучым беларускім грамадзтве:

«...Ронд наш павінен быць на ўсё чуткі, каб мог ***для дабра народнага за ўсяго карыставаць***».

5. Каліноўскі адкідае расейскі тэзіс пра «брацтва» беларускага і расейскага народаў, моцна яго крытыкуе, піша пра рэкруцкія наборы, высылкі ў Сібір і параўноўвае расейскіх чыноўнікаў з саранчой. Паводле Каліноўскага, Расея

«пабіўшыся з палякамі, ***каб удзяржаць сваё панаваньне, да нашага брацтва хоча ўпісаціся***».

6. Каліноўскі разумее, што з усіх суседзяў Беларусі менавіта Расея распрацавала найбольш

грунтоўны комплекс ідэалягічных і гістарычных аргумэнтаў для асыміляцыі беларусаў. Ён піша пра несправядлівую забарону Ўніяцкай царквы і, фактычна, выказваецца за яе вяртаньне:

«...Каб сьлёзы мужыцкія ня трапілі перад трон праўдзівага Бога, ***забралі нам і духоўну нашу пацеху — нашу веру ўніяцкую***».

7. Каліноўскі ставіць пытаньне пра адукацыю на роднай мове. Два апошнія тэзісы, відавочна, разумеюцца ім як процівага асыміляцыі:

«...***Маскаль... там, дзе жылі палякі, літоўцы і беларусы, заводзіць маскоўскія школы, а ў гэтых школах вучаць па-маскоўску, гдзе ніколі не пачуеш і слова па-польску, па-літоўску да і па-беларуску***».

8. Каліноўскі высоўвае тэзіс пра разьвіцьцё ў будучай Беларусі ўсеагульнай адукацыі, культуры і навукі як гарантыю ўсеагульнага дабрабыту:

«...***Нямаш, браткі, большага шчасьця на гэтым сьвеце, як калі чалавек у галаве мае розум і науку. Тагды ён толька магчыме жыці ў багацтве, па праўдзе***».

9. Каліноўскі называе найбуйнейшую геапалітычную пагрозу для існаваньня Беларусі і беларускага народу. Гэта — «маскаль», Расея:

«***Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, Народзе, што тагды толькі зажывеш шчасьліва, калі над табою Маскаля ўжэ ня будзе***».

10. Каліноўскі ставіць пытаньне пра неабходнасьць арыентацыі Беларусі на Польшчу, а значыць — на Захад. Ён відавочна яшчэ ня мае яснага бачаньня далейшага лёсу сваёй краіны,



Сям'я Ямантаў. Стаіць зьлева — нарачоная Каліноўскага Марыя Ямант, «Марыська чарнаброва»

ня ведае, у якой форме будзе захаванае адзінства Польшчы, Літвы і Беларусі — фэдэрацыі, канфэдэрацыі ці нейкай іншай форме дзяржаўнага саюзу — і ці будзе яно захаванае наогул. Але праз увесь тэкст «Лістоў з-пад шыбеніцы» параўноўвае парадкі і падыходы «ронду польскага» з «рондам маскоўскім» і прыходзіць да высновы, што

> «...***Польскае дзела гэта наша дзела, гэта вольнасьці дзела***».
>
> «Для таго, Народзе, як толька калі пачуеш, што ***браты твае з-пад Варшавы б'юцца за праўду і свабоду***... грамадой ідзі ваяваці за сваё чалавечае і народнае права, за сваю зямлю радную».

Арыентацыю на Польшчу XIX стагодзьдзя ва ўмовах тагачаснага процістаяньня з Расеяй — у XXI стагодзьдзі можна сьмела трактаваць як заклік Каліноўскага да празаходняй геапалітычнай арыентацыі Беларусі і жыцьцёвую неабходнасьць такой арыентацыі для народу і краіны ў будучыні.

Апошняя цытата наогул усёабдымная. Яна адна можа быць і палітычным запаветам, і нацыянальнай ідэяй. Тут зьвяртаюць на сябе ўвагу тэзіс пра «чалавечае права» (захаваньне правоў чалавека), пра «народнае права» (захаваньне нацыянальных правоў), а за заклікам ваяваць «за сваю зямлю радную» зноў стаіць тэзіс пра вялікую каштоўнасьць патрыятызму і любові да Бацькаўшчыны.

Гэта — клясыка беларускай палітычнай ідэі, яе вытокі.

Сымболіка ягонай сьмерці

На дзейнасьць і тэксты Каліноўскага можна паглядзець з пункту гледжаньня моднай у яго часы філязофіі гісторыі нямецкіх мысьляроў Шэлінга і Гегеля. Развагі ў сымбалічных катэгорыях прыводзяць да наступных высноваў.

Шэлінг падзяліў усе народы на гістарычныя і негістарычныя. Паводле яго, гістарычны народ рэалізуе нейкую звышідэю дабра, праўды і красы. Негістарычныя народы такога пакліканьня ня маюць і таму знаходзяцца ў духоўным рабстве ў гістарычных.

Гегель лічыў, што гісторыяй кіруе сусьветны дух, які самарэалізуецца і пазнае самога сябе. Паводле Гегеля, кожны народ мае права зрабіць свой унёсак у гісторыю, але ў канкрэтны пэрыяд гісторыі сусьветны дух аддае перавагу аднаму народу-пераможцу. Народ-пераможца заўсёды мае рацыю, бо абраны на сваю ролю духам гісторыі.

Славян на герархічнай лесьвіцы гісторыі Гегеля не было зусім. Ён лічыў, што славяне асуджаныя на пажыцьцёвае рабства ў нямецкай цывілізацыі. Менавіта немцы, паводле Гегеля, былі тагачаснай вяршыняй сьвету.

Тым ня менш, абодва гэтыя нямецкія філёзафы ў 30–50-я гады XIX стагодзьдзя зрабілі вялікі ўплыў на грамадзкую думку Расеі. «Заходнікі» з Гегелем згаджаліся і заклікалі Расею працягнуць шлях, вызначаны Пятром I. «Славянафілы» адкідалі тэзіс нямецкіх філёзафаў пра перавагу германцаў як спадчыньнікаў Рыму і лічылі Расею асобнай славянскай цывілізацыяй, пераемніцай Грэцыі.

У маленькім сусьвеце, якім для Каліноўскага зьяўлялася ўсходняя Эўропа зь пераможнай Расеяй і пераможанай Польшчай, была свая драма і свой выклік. Для беларусаў пераможцамі былі і Расея, і Польшча. Ад імя беларусаў Каліноўскі кінуў выклік абодвум народам-пераможцам і нямецкай філязофіі гісторыі наогул. І выйграў.

Ён нібы адчуваў, што кароткага пэрыяду ягонай дзейнасьці і ягоных тэкстаў аказалася недастаткова, каб ужо тады абудзіць беларусаў да гістарычнага быцьця і вывесьці іх на шлях са-

марэалізацыі і дасягненьня ўсеагульнага «народнага дабра», таму не захацеў эміграваць і пайшоў на найвышэйшую ахвяру.

Перад сьмерцю ён сымбалічна адмовіўся ад паслугі сьвятара і напісаў пра гэта ў «Лістах з-пад шыбеніцы», каб нашчадкі дакладна ведалі, чаму ён адмовіўся ад «неба» і дзеля чыёй «праўды»:

Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці
Дай ў прадвечнага саду вялеў прападаці,
То мы прападзем марна, но праўды ня кінем,
Хутчэй Неба і шчасце, як праўду, абмінем.

Гэта агаломшвае! Сьмерць уласнай душы, сашэсьце ў пекла для абуджэньня і ўратаваньня душы народу! Паводле хрысьціянскай традыцыі, так зрабіў Ісус Хрыстос, калі пасьля сьмерці на крыжы сышоў у пекла, зьнішчыў яго і вывеў адтуль праведнікаў — свой народ.

Няма сумневу, што Каліноўскі ведаў, што робіць, і выбраў сьмерць сьвядома і сымбалічна. Першы палітык мог паступіць толькі так, ён мусіў пайсьці да канца. Інакш нельга было перамагчы народы-пераможцы — расейцаў і палякаў.

Яго сьмерць у процістаяньні з гэтымі народамі, несумненна, мела сваю трансцэндэнтную сымболіку. Каб перамагчы сусьветны дух і яго абраньнікаў — гэта значыць адстаяць «нашу праўду», пад якой можа разумецца толькі праўда беларуская, патрэбны чын — нешта вельмі моцнае, магутнае, напрыклад, нечуваная, неверагодная ахвяра.



Лукіскі гандлёвы пляц у Вільні ў 1860-я гады XIX стагодзьдзя. На пярэднім пляне месца, дзе адбылося пакараньне сьмерцю Кастуся Каліноўскага

Каліноўскі выбірае поўны, татальны нябыт — сьмерць і фізычную, і духоўную; ахвярае ня толькі целам, але і душой. Для верніка адмаўленьне ад вечнага жыцьця («Хутчэй Неба і шчасьце, як праўду, абмінем») — гэта катастрофа.

Адначасова ён не адступаецца ад свайго народу і яго дабра: «...Мы прападзем марна, но праўды ня кінем». Ён лічыць, што маштаб ахвяры варты ягонай мэты.

Ахвяра Каліноўскага не была адмаўленьнем ад веры і ад Бога. Наадварот, ён застаецца шчырым вернікам, бо дзейнічае ў сыстэме хрысьціянскіх каардынат — Бог, Неба, пекла — і хрысьціянскага запавету: «Няма большае за тую любоў, як калі хто пакладзе душу сваю за сяброў сваіх» (Эвангельле ад Яна, 15:13)



Пахаваньне Кастуся Каліноўскага і яго паплечнікаў 22 лістапада 2019 году ў Вільні. Калёна пад Вострай брамай

Каліноўскі ведаў ад чаго адмаўляецца, дзеля чаго адмаўляецца і дзеля каго:

Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасьці, жыві ў свабодзе.
І часам спамяні пра Яську твайго,
Што згінуў за праўду для дабра твайго.

Беларусь і беларусы ня зьніклі, але «выбрынулі», як пісаў у XVI стагодзьдзі Васіль Цяпінскі, на паверхню гісторыі, да гістарычнага быцьця.

Чын Кастуся Каліноўскага натхняў многія пакаленьні беларусаў, а яго выхад зь зямлі праз 155 гадоў і містэрыя пахаваньня ў драматычны для беларускай незалежнасьці час — натхняюць і дапамагаюць далей.

А сьвятарскую паслугу ён у 2019 годзе, падчас пахаваньня ў Вільні, атрымаў спаўна! У Бога часу не існуе.

Хто ён для нас

Яшчэ ў Санкт-Пецярбурскім унівэрсытэце студэнты назвалі Каліноўскага апосталам — за глыбокую перакананасьць у сваіх ідэях.

Пасьля сьмерці апосталам яго назвалі і сучасьнікі. Польскі гісторык Юзаф Яноўскі так і напісаў пра яго:

«Шчыры апостал беларускага народу».

Кастусь Каліноўскі сапраўды зьяўляецца апосталам Беларусі, апосталам беларушчыны і беларускай мовы. Але ня толькі.

Вінцэнта Канстанціна (Кастуся) Каліноўскага можна сьмела называць

- пачынальнікам беларускай нацыянальнай ідэі,
- айцом беларускай нацыі,
- палітычным бацькам Беларусі.

Пры ўважлівым аналізе робіцца відавочным, што беларускія палітыкі пачатку XX стагодзьдзя былі ідэйнымі нашчадкамі і пасьлядоўнікамі Кастуся Каліноўскага.

Айцу-заснавальніку мадэрнай Беларусі было ўсяго 26 гадоў, калі ён прыняў пакутніцкую сьмерць за бацькаўшчыну, напісаўшы перад гэтым:

«Горка пакінуць зямельку родную і Цябе, дарагі мой народзе...»

Паклонімся яму.

Лістапад 2019 — студзень 2020,
Прага

Крыніцы і літаратура:

Юліюш Бардах. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Менск, 2010
Беларуская літаратура XIX стагодзьдзя. Хрэстаматыя. Укладальнікі Алег Лойка і Вячаслаў Рагойша. Менск, 1988
Васіль Герасімчык. Канстанцін Каліноўскі: асоба і легенда. Горадня, 2018
Калиновский К. Из печатного и рукописного наследия. Минск, 1988
Кастусь Каліноўскі. За нашую вольнасьць. Творы, дакумэнты. Укладальнік Генадзь Кісялёў. Менск, 1999
Вінцэсь Каратынскі. Творы. Менск, 1994
Генадзь Кісялёў. Пачынальнікі. Менск, 1977
Генадзь Кісялёў. Героі і музы. Менск, 1982
Генадзь Кісялёў. Смак Беларушчыны. Менск, 2013
Генадзь Кісялёў. Выбранае. Менск, 2016
Алег Латышонак. Нацыянальнасьць — беларус. Менск, 2009
Генадзь Сагановіч. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасьці да канца XVIII стагодзьдзя. Менск, 2001
Аляксандар Смалянчук. Раман Скірмунт (1868 – 1939): жыцьцяпіс грамадзяніна краю. Менск, 2018
Каміла Янушкевіч, Язэп Янушкевіч. Партрэты паўстаньня. 1863-1865. Ракаў, 2019
http://kalinouski.arkushy.by
http://pawet.net

Дадатак

Кастусь Каліноўскі. Да беларускага народу (Лісты з-пад шыбеніцы)

***

І да нашага кутка даляцела ваша Газэтка, і мы яе з увагай прачыталі; вельмі яна ўсім спадабалася, бо праўда напісана. Прыймеце для таго нашу падзяку, а пісьмо аддрукуйце, каб знаў сьвет Божы, як мужыкі Беларусы глядзяць на маскалёў і паўстаньне польскае, чаго яны хочуць і чаго па сваей сіле дабівацісяя будуць. Слова наша простае, но зато шчырае; калі яно дойдзе да ронду польскага, адкрые яму нашу грудзь да і пакажа, што па-нашаму рабіці трэба, каб панаваньню маскоўскаму не цяпер, то пазьней канец ужэ палажыці.

За ўсіх старон маскалі цяпер талкуюць нам без устанку а сваём брацтве з намі. Праўдзіва дзівота, жывучы пад рондам маскоўскім гэтулькі часу, цяпер ледзь мы аб гэтым пачулі, для таго не без карысьці будзе паглянуць, як гэта маскоўскія браты самі ў сябе гаспадарылі да і з намі рабілі, каб пазнаць іх шчырасьць і права на брацтва нашае.

Не будзем гаварыці, зь якіх народаў маскалі паўсталі, брацтва там ня многа найдзем, няволя манголаў да і цароў маскоўскіх заўсім забіла ў гэтам народзе ўсякую памяць а свабодзе да і зрабіла зь яго грамады людзей паганых бяз мыслі, бяз праўды, без справядлівасьці, без сумленьня

да і без баязьні Боскай. З гэтакім народам цары маскоўскія, што то жывуць людзкою крыўдаю, падбілі зямлю нашу пад сваё панаваньне, тут то мы іх і пазналі, гэтых, як яны сябе называюць, братоў нашых.

Ронд польскі, правіўшы намі, ня браў з нас рэкрута, не адрываў народу ад дзяцей, ад бацькоў да і ад зямлі роднай і ня гнаў гдзесь у канец сьвета, каб завадзіць няволю, выціскаць сьлёзы і праклёнства на душы нашай. Ронд польскі калі браў з нас падымнае, то не заводзіў гэтакіх стаенных падаткаў па душы нашы, што то да Бога адно належаць. Ронд польскі, маючы Бога ў сэрцу, не ўпісаў нас у сызму, у каторай адно за цара да за цара маліціся трэба, як бы ўжэ цар быў Богам на сьвеце, а вера да казны належала. Ронд польскі ўжо таму будзе 70 лет, выпераджаючы многа суседзкіх народаў, пачаў ужэ талкаваці а свабодзе мужыцкай і роўнасьці братняй мужыка з шляхціцам, а енарал Касьцюшка, што то, кажуць, каля Слоніма радзіўся і а каторым народ наш сьпявае, што ён вельмі быў добрым і маскаля крэпка біў, высказаўся ён за вольнасьць нашу, но маскаль то перашкодзіў і завёў свае ронды.

Пагляньма ж цяпер, што ён зараз пачаў рабіці, гэты дабрадзей мужыцкі, як сам цяпер кажа: найперш, каб не магло вырабляціся сумленьне народнае, пакасаваў маскаль усе сходкі людзей выбарных, усе школы нашы, а так, абабраўшы з сумленьня да і з розуму, а завёўшы ў нас свой парадак маскоўскі, пазволіў кожнаму дужшаму глуміцца над бедным як толька хоча. Паноў

заўсім увольніў ад усякіх ценжараў, даў ім права завадзіць паншчыну маскоўскую, а яна то ня тры дай ня шэсьць дзён з хаты, но 6 дзён з душы рабочай. Мужыку ня толька што ня даў ніякага права, но яшчэ адабраў і тое права, якое ён меў ад ронду польскага; многа людзей вольных да і каралеўшчызны вялеў у паншчызну ўпісаць, кажнаму можна было мужыка крыўдзіць, а чыноўнікі маскоўскія не рабілі яму ніякай справядлівасьці, но яшчэ калі суд на глум не ссылаў мужыка ў Сібір, то аддаваў на вечнасьць у салдаты. Калі які пан, паслухаўшы сумленьня, ішоў за праўду і справядлівасьць і праціўляўся прыказу царскаму, каторы кажа: «дзяры, бяры да і маўчы», тады яго, калі не ўцёк да пранцуза, у турму бралі да і ў Сібір гналі, а двор з людзьмі ў казну забралі, стуль то ў нас і мужыкі казённыя. Пярвей яны служылі казьне паншчызну, а посьле ў аброк іх упісалі, дай акром аброку ганялі без ніякай падзякі ўсялякаму чорту на работу: то акружному, то асэсару дай кожнаму, хто адно перакупіў.

Начальства ось то якое маскоўскае для мужыкоў, а нібы дабрадзей! Няхай той сам судзіць, хто пісьмо мае чытаці будзе, я адно скажу па шчырай праўдзе: што калі нам пад рондам польскім не заўсім было добра, то як маскаль стаў намі правіць, зрабіў ён для мужыкоў чыстае пекла на сьвеце.

Тут сказаці яшчэ трэба, што ён змусіў нас пакідаці бацькаўшчызну, ісьці ў рэкруты, дай ваяваці не за прыказ Боскі, не за праўду і справядлівасьць, но за глум, за няволю ня раз праціў

братоў да бацькоў нашых. Тут сказаці трэба, што маскаль, дабрадзей мужыцкі, зьняўшы з паноў усялякія падаткі, зваліў іх адно на мужыцкае племя, аблажыў падаткамі і мужыцкую зямлю, і мужыцкія хаты, і мужыцкую душу, і мужыцкія дзеці, і мужыцкую скаціну, жывых і ўмершых.

Но ня тут яшчэ канец маскоўскага дабрадзейства. — Зь дзядоў і прадзедаў была ў нас уніяцкая вера, гэта значыць, што мы, будучы грэцкай веры, прызнавалі за намесьнікаў Боскіх сьвятых айцоў, што ў Рыме. Царом маскоўскім і гэта стала завідна, для таго, скасаваўшы ў Маскве грэцкую веру, а зрабіўшы царскую, што то называецца праваслаўе, і нас адарвалі ад праўдзівага Бога і ўпісалі ў сызму пагану. Такім спосабам, абабраўшы з гроша, з рук спасобных, запраглі нас у паншчызну, і каб сьлёзы мужыцкія ня трапілі перад трон праўдзівага Бога, забралі нам і духоўну нашу пацеху — нашу веру ўніяцкую. Праўда, людцы, ёсьць за што падзякаваці!..

А чыноўнікі то маскоўскія — яшчэ адно дабрадзейства. Чытаў я ў ксёнжках, што ёсьць на сьвеце якась саранча, катора як гдзе пакажацца, усю худобу гаспадарску зглуміць. Маем мы, браткі, горшую яшчэ ад той саранчы, а гэта чыноўнікі маскоўскія з сваёю «праўдаю» і «справядлівасьцею», яны людзі вельмі здатныя, што то па-маскоўску «праворныя», умеюць так аблізаць чалавека, што з рук іх выйдзеш голенькі як маці радзіла — і жыві пад гэтакім рондам без суду і праўды.

Зараз па вайне з пранцузам пад Севастопалем пачалі меж намі слухі хадзіці, што маюць мужыкам даць вольнасьць. Ждалі мы доўга, аж нарэшце тры леты таму выйшаў указ царскі, — праўда, многа там было напісана, а карысьці то для нас мала. Парабілі адно канцылярыі, пасрэднікаў, старшынаў, пісараў усё за грошы мужыцкія, а паншчызну як хадзілі, так і трэба было хадзіці. Дачуўшы мы гэта, сталі праціўны, і тут то і маскалі нашліся, каб прымусіць нас да міласьці царскай, а нагайка казацкая мела скрапіць наш братні ўзел, ня ведаю адно з кім: ці з панамі, ці з маскалямі. Няхай за мяне скажуць тыя, што мелі ахвоту скрапляці, дабрадзеі нашыя, браты маскоўскія.

Трудна сказаць, як доўга мы бы паншчызну хадзілі, каб не паўстаньне польскае. Ронд польскі, аб'явіўшы свой маніхвэст, зямлю мужыцкую аддаў мужыком на вечнасьць, і мы то перасталі зараз паншчызну хадзіць. А калі Бог усёмагучы навярнуў паноў да праўды і зрабіў іх паслушнымі прыказам ронду польскага, тагды маскалём настаў кепскі час, і ён мусіў паняволі прыпісаціся да нашага і жыдоўскага брацтва. Бач, які мудроны брат; аднак крыху і так ашукаўся, бо як той казаў: «і ў брата не свая хата», і брат пайшоў бы ў паўстаньне, каб меў якую качаргешку ў рукі ўзяці; а жыд, хаця пагаворка і кажа: «што як бяда, то да жыда», не заўсягды голых прымае, тым бардзей такіх, што нажлапталіся нямала і сьлёз і крові жыдоўскай.

Но каб ляпей пазнаць маскоўскую хітрасьць, пагляньмы шчырым окам, што цяпер маскалі выраблялі з намі, у гэту ліхую для сябе гадзіну, калі, пабіўшыся з палякамі, каб удзяржаць сваё панаваньне, да нашага брацтва хоча ўпісаціся; ронд польскі цяпер аддае нам на вечнасьць зямлю нашу за нашу працу, маскаль піша дай устанаўляе якіясь там чыншы, каторым ніколі ніякага канца ня будзе, як то меж мужыкамі казённьмі. Калі ронд польскі дае нам вольнасьць праўдзівую, маскаль, не кажу цэлымі сёламі, а цэлымі грамадамі гоніць людзей, заўсім адняўшы свабоду, у сібірскія пустыні.

Калі ронд польскі ўсім братнім народам дае самарондства, маскаль мала таго, што гэтак ня робіць, но яшчэ там, гдзе жылі палякі, літоўцы і беларусы, заводзіць маскоўскія школы, а ў гэтых школах вучаць па-маскоўску, гдзе ніколі не пачуеш і слова па-польску, па-літоўску да і па-беларуску, як народ таго хоча, а ў гэтыя школы адно з другога канца сьвета маскалёў насылаюць, што толька ўмеюць красьці, людзей абдзіраці дай служыць за грошы паганаму дзелу на глум народу. Дзікі маскаль думае, што калі можа народ абдзіраці за ўсякага дабытку, то і патрапіць кажнаму ўбіць у галаву свой дурны розум, дурны для таго, што розум маскоўскі калі ня раз харашо кажа, то ніколі па-людзку нічога ня робіць, адно людзей абманывае, а перад кнутом царскім гнецца, як астатні валацуга.

Трудна ўсё гэта расказаці, што мы ўжэ кроўю запісалі, так што сьлёзы льюцца, чытаючы

бяспраўе, якое маскалі рабілі дай да гэтай пары яшчэ робяць. Хто хоча дазнаць праўдзівага смаку, няхай сам пажыве пад рондам маскоўскім, то і паглядзіць, якое дабрадзейства мужыкі мелі; ось то для чаго кажам: што польскае дзела гэта наша дзела, гэта вольнасьці дзела.

Но ня мала працы трэба, каб здабыць гэту свабоду, каторай жджэ ўсякі, пачаўшы ад дзіцяці да старога дзеда, бо калі маскаль гэтулькі лет упускаў свае пазуры ў грудзь нашу, так ня дзіва, што трэба пацярпець доўга, каб вырвацца з-пад яго братняй апекі, для таго і не без карысьці будзе, калі цяпер паталкуем, якія мы маем на то способы; гаварыць тут будзем мало, кожны ведае для чаго, бо маскаль не павінен ведаць, пераняўшы на прыпадак пісьмо гэта.

Доўга палякі ждалі памоцы з заграніцы, народы чужаземныя крычалі многа і да гэтай пары нічога для нас не зрабілі; кажуць, што яны ня маюць ніякай патрэбы сваей у польскім дзеле, каб на маскаля ісьці за нас ваяваці. Дзьвесці лет таму назад, а бацькі нашы ляпей ужэ казалі: «Калі маеш Бога ў сэрцу і прыказ Яго, памагай бліжнему» і ішлі бараніць хрысьціянства ад татарскай дзічы; да гэтакай памоцы хаця і маем права, но мы не вымагаем, няхай кожан робіць, як яму ляпей здаецца. Аднак сказаці тут трэба, што калі ўсе каралі падпісалі нашу няволю маскоўскую, то яны вельмі скрыўдзілі чэсьць сваю, што змыць гэтае бясчэсьце ня толька патрэба, но кожан мусіць, каб мець сумленьне чыстае. Для таго, знаючы, як стаіць наша дзела за граніцай, не перастаем

верыць, што мысьль Боска, правёўшы векі, ня дасьць загінуць праўдзе і справядлівасьці, калі ўжэ не найдзе для таго способу ў цяперашнім парадку, разарве гэты ўзёл дай паверне сілу народу куды схоча.

Нам адно сільна з шчырай верай за сваё стаяці трэба, а ронд наш павінен быць на ўсё чуткі, каб мог для дабра народнага за ўсяго карыставаць; сілы нашы яшчэ вялікі, ваяваць зь німі можам Бог ведае як доўга, но для таго трэба, з аднэй стараны, іх аберагаць, а з другой, вырабляць што раз то новыя. І так калі паўстаньне зроблена пад добрую пару, узрастае і ажыўляе народ, — ня ў час, марнуе сілы кожнага, аслабляе ў прастоце духа дай разводзіць страх і няверу ў дзела наша, у моц Божу. Ронд польскі і яго чыноўнікі ведаюць гэта і для таго, каб служылі добра перад Богам і сумленьнем народным, робяць ня штучныя завірухі, но, паняўшы духа народнага, яго патрэбы і волю, [будуць] падхватываць дай разумна застаўляць палкі народныя, а разьвіваючы непадатлівасьць у народных несканчоных бунтах, ставіць апору маскоўскаму ў нас панаваньню.

Работа тут ня хутка дай непаказна, но за то пэўна, і яна нас давядзе да канца добрага. Работа тут сярмяжна, для таго каб была скутэчна, павінна быць так шчыра і проста, як тое сэрца, што б'е пад сярмягай, як той розум мужыцкі, што не перабірае, калі рабіць трэба. Тагды слова ронду польскага — «вольнасьць, роўнасьць дай свабода народу» — пяройдзе ў кроў кожнага і цэла моц

маскоўская нас не пераможа, хаця ж бы яму самое пекла памагаці стала.

Рук ахвотных і сягодня ў нас даволі, но з голымі рукамі не ісьці на штыкі маскоўскія. Ронд польскі і яго чыноўнікі павінны добра над гэтым падумаць, грошы ў нас будуць, бо мы знаем патрэбу таго, бо мы маем способы на тое. Но каб за нашы грошы мы мелі што ў рукі ўзяці, Ронд польскі гэтаму зарадзіць; а калі натрапіць перашкоды, то пры памоцы Бога і свайго права, упісанага ў нашых грудзях, усё з часам пераможа.

Ты, аднак, Народзе, не дажыдайся, да з чым можаш ідзі ваяваці за свайго Бога, за сваё права, за сваю хвалу, за сваю бацькаўшчызну. Для цябе ўсё можна: нож, сякера, атрута; гэта твае способы, бо табе, як таму мужыку нявольнаму, бяспраўнаму, не прызнаюць права самаабароны, бо табе нічога ня можна. А калі народы заграничныя, зь дзіва разінуўшы рот, скажуць: «шалёныя», Ты, народзе вялікі і чэсны, праўдай ім адкажы, што яны таму прычынай, што гэта на іх сумленьне цяжкім грэхам ляжа.

***

Марыська чарнабрэва, галубка мая,
Гдзе ж ся падзела шчасьце і ясна доля твая?
Усё прайшло, — прайшло, як бы не бывала,
Адна страшэнна горыч у грудзях застала.

Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці
Ды ў прадвечнага саду вялеў прападаці,

То мы прападзем марна, но праўды ня кінем,
Хутчэй Неба і шчасьце, як праўду, абмінем.

Не наракай, Марыся, на сваю бяздолю,
Но прыймі цяжкую кару Прадвечнага волю,
А калі мяне ўспомніш, шчыра памаліся,
То я з таго сьвету табе адазвуся.

Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасьці, жыві ў свабодзе.
І часам спамяні пра Яську твайго,
Што згінуў за праўду для дабра твайго.

А калі слова пяройдзе у дзела,
Тагды за праўду станавіся сьмела,
Бо адно з праўдай у грамадзе згодна
Дажджэш, Народзе, старасьці свабодна.

***

Браты мае, мужыкі родныя. З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіць мне да вас пісаці, і можа раз астатні. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, — но ня жаль згінуць за тваю праўду.

Прыймі, народзе, па шчырасьці маё слова прадсьмертнае, бо яно як з таго сьвета толькі для дабра твайго напісана.

Нямаш, браткі, большага шчасьця на гэтым сьвеце, як калі чалавек у галаве мае розум і навуку. Тагды ён толька магчыме жыці ў багацтве,


папраўдзе, тагды ён толька, памаліўшысь Богу, заслужыць неба, калі збагаціць наукай розум, разаўе сэрца і радню цэлу сэрцам палюбіць. Но як дзень з ноччу ня ходзіць разам, так не ідзе разам наука праўдзіва зь няволяй маскоўскай. Дапокуль яна ў нас будзе, у нас нічога ня будзе, ня будзе праўды, багацтва і ніякай навукі, — адно намі, як скацінай, варочаць будуць не для дабра, но на пагібель нашу.

Для таго, Народзе, як толька калі пачуеш, што браты твае з-пад Варшавы б'юцца за праўду і свабоду, тагды і ты не аставайся ззаду, но, ухапіўшы за што зможаш, за касу, сакеру, цэлай грамадой ідзі ваяваці за сваё чалавечае і народнае права, за сваю зямлю радную.

Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, Народзе, што тагды толькі зажывеш шчасьліва, калі над табою Маскаля ўжэ ня будзе.


Твой слуга Яська-гаспадар з-пад Вільні

Аўтограф трэцяй часткі «Лістоў з-пад шыбеніцы»




58

Braty maje, mużyki rodnyje.
Z pad szubienicy maskouskoj
pryjchodzić mnie da was pisaci,
i może raz astatni. Horko
pakinuć ziemielku radnuju
i Ciebie, darahi moj narodzie.
Hrudzi zastohnuć, zabolić
serce, — no nie żal zhinuć za
twaju praudu. —
Pryjmi narodzie pa szczyraści
~~[illegible]~~ maje słowo predśmier-
tnoje, bo jeno jak z taho świeta
tolko zła twaho dabra ~~[illegible]~~
napisano. —
Nieman ~~[illegible]~~ Bratki bolszaho szcza-
ścia na hetom świeci, jak kali


czeławiek u haławie maje rozum
i nauku. Tahdy jon tolko mah-
czymie żyć u bahactwu pa-
prawdzie, tahdy jon tolko pa-
malinszys Bohu zasłużyć
niebo, kali zbahacić naukoj
rozum, razawje serce i radniu
cełu sercom palubić.
No jak dzień s noczju nie chodzić
razom, tak nie idzie razom na-
uka prawdziwa z niawolej
maskouskoj. Dapokul jena
u nas budzie, u nas niczoho
nia budzie, nie budzie prawdy,
bahactwa i nijakoj nauki; –

59

adno nami jak skacinoj waro-
czać budzić nie źla dabra, no
na pahibiel naszu.
Źla toho Narodzie, jak tolko kali
paczujesz, szto braty twaje
s pad Warszawy bjuć sa
za prawdu i swabodu, tahdy
i ty nie astawajsa s zadu,
no uchapiuszy za szto zmożesz,
za kosu, sakieru, cełoj hrama-
doj idzi wajawaci za swoje cze-
ławieczoje i narodnoje prawa,
za swaju ziemlu radnuju.
Bo ja tabie s pad szubienicy każu
Narodzie, szto tahdy tolko zaży-
wiesz szczaśliwo kali nad taboju



38–

Maskala uże nie budzie..

Twoj słuha ~~[illegible]~~

Jaśko haspadar s pad Wilni.

38

Паказьнік асобаў

Пра аўтара

Сяргей Абламейка нарадзіўся ў 1962 у Менску. Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту і дактарантуру Люблінскага каталіцкага ўнівэрсытэту (Польшча). Доктар гісторыі. Працаваў сьлесарам на Менскім аўтамабільным заводзе, выкладаў гісторыю ў школе, быў навуковым супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага музэю народнай архітэктуры і побыту, а затым Скарынаўскага цэнтру Акадэміі навук Беларусі. Зь верасьня 1990 — журналіст «Свабоды» ў Менску, з траўня 1995 у Празе. Зь сярэдзіны 1980-х гадоў займаўся актыўнай грамадзкай дзейнасьцю, быў членам «Талакі». Адзін з арганізатараў першага Вальнага сойму беларускіх суполак (1987), выдавец часопісу «Унія» (1990). Аўтар некалькіх дзясяткаў навуковых публікацый па гісторыі Беларусі. З 1983 друкуецца як пісьменьнік і журналіст. Выдаў кнігі «EGOізмы», «Настальгія», «Мой Картаген», «Дом літаратара», «Нечаканы Скарына». Тэксты перакладаліся на італьянскую, польскую, расейскую і чэскую мовы.

Summary

"Kalinouski and the Political Birth of Belarus" — is a book about the origins of the modern Belarusian nation and the role Vincent Kanstancin (Kastus) Kalinouski played as the nation's founding father.

It was only in the 19th century that the ethnonym "Belarusian" became permanently associated with the Belarusian people. The direct catalyst for this development was an anti-Russian uprising in the years 1863-64. This insurgency, while composed largely of Poles and Lithuanians, also had a distinct Belarusian national and ideological contingent, the leader of which was Kastus Kalinouski.

On February 1, 1863 it was officially declared that a "Provisional Provincial Government of Lithuania and Belarus" would have Kalinouski as its head.

According to the author, it was on this day that the first political institution of a new Belarus came into existence.

Siarhiej Ablameika has authored books of aphorisms, essays, short stories and numerous other works on Belarusian culture, the history of the Uniate (Greek-Catholic) Church of Bealrus, and national identity.

He works at Radio Free Europe/Radio Liberty, and lives in Prague.


«Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе» — кніжны праект Беларускай службы Радыё Свабода. Чытайце ў інтэрнэце: **www.svaboda.org**




Верш на Свабоду.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2002. — 464 с.



Дарога праз Курапаты.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2002. — 464 с.: іл.



Poems on Liberty: Reflections for Belarus.
Пераклады Веры Рыч.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2004. — 312 с.



Быкаў на Свабодзе.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2004. — 536 с.: іл.



Быкаў на Свабодзе.
Збор выступаў клясыка беларускай літаратуры ў этэры Радыё Свабода. Аўдыёдыск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2004.




Дуліна ад Барадуліна.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2004. — 254 с.: іл.



Аляксандар Лукашук.
Прыгоды АРА ў Беларусі.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2005. — 500 с.: іл.



Быкаў на Свабодзе.
2-е выд., дапоўненае.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2005. — 662 с.: іл.



Сяргей Дубавец.
Вострая Брама.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2005. — 520 с.



Вячаслаў Ракіцкі.
Беларуская Атлянтыда.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2006. — 504 с.: іл.



Плошча, 19.03–25.03.2006.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2006. — 400 с.: іл.




Вінцэсь Мудроў.
Альбом сямейны.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2007. — 232 с.: іл.



Начная чытанка. 50 аўтараў з этэру Радыё Свабода.
Мультымэдыйны дыск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2007.



Уладзімер Арлоў.
Імёны Свабоды.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2007. — 576 с.: іл.



Івонка Сурвіла.
Дарога. Стоўпцы – Капэнгаген – Парыж – Мадрыд – Атава – Менск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2008. — 144 с.: іл.



Пётра Садоўскі.
Мой шыбалет.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2008. — 426 с.: іл.



Начная чытанка 2. 50 аўтараў з этэру Радыё Свабода.
Мультымэдыйны дыск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2009.



Адзін дзень палітвязьня.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2009. — 364 с.: іл.



Юры Дракахруст.
Акцэнты Свабоды.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2009. — 430 с.: іл.



Сяргей Дубавец.
Як? Азбука паводзінаў.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2009. — 252 с.: іл.



Міхась Скобла.
Вольная студыя.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2009. — 554 с.: іл.



Барды Свабоды.
Зборнік гутарак і песень 50 удзельнікаў аднайменнай перадачы Радыё Свабода. Мультымэдыйны DVD-дыск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2010.



Васіль Быкаў.
Доўгая дарога дадому.
Чытае аўтар.
Мультымэдыйны дыск.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2010.



Вячаслаў Ракіцкі.
Беларуская Атлянтыда.
Кніга другая.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2010. — 352 с.: іл.




Сто бардаў Свабоды. Зборнік гутарак і песень 100 удзельнікаў перадачы «Барды Свабоды». Мультымэдыйны DVD-дыск. Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011.



Галіна Руднік. **Птушкі пералётныя.** Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011. — 192 с.: іл.



Галасы Салідарнасьці. Міжнародная падтрымка беларускай дэмакратыі. Мультымэдыйны DVD-дыск. Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011.



Вячаслаў Ракіцкі. **Сто адрасоў Свабоды.** Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011. — 330 с.



Саўка ды Грышка. Год першы. Калекцыя 50 песьняў – падзеі году ў сатырычным дуэце Лявона Вольскага з самім сабой на Радыё Свабода. Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011.




Альгерд Бахарэвіч. **Малая мэдычная энцыкляпэдыя Бахарэвіча.** Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011. — 320 с.: іл.



Аляксандар Лукашук.
Сьлед матылька. Освальд у Менску.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011. — 390 с.: іл.




Адзін дзень палітвязьня. 2009–2011.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2011. — 328 с.: іл.



Уладзімер Арлоў.
Пакуль ляціць страла.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2012. — 400 с.: іл.



Уладзімер Арлоў.
Імёны Свабоды.
Аўдыёкніга.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2012.



Сяргей Дубавец.
Майстроўня. Гісторыя аднаго цуду.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2012. — 464 с.: іл.




Слоўнік свабоды.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2012. — 516 с.




Саўка ды Грышка. Сто песень. 2010-2012.
Поўны збор запісаў сатырычнага дуэту Лявона Вольскага з самім сабой на Радыё Свабода. Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2012



Альгерд Бахарэвіч.
Гамбурскі рахунак Бахарэвіча.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2012. — 428 с.: іл.




Валер Каліноўскі.
Справа Бяляцкага.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2012. — 364 с.: іл.




Юры Бандажэўскі.
Турма і здароўе.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2013. — 250 с.: іл.



Алег Грузьдзіловіч.
Хто ўзарваў менскае мэтро?
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2013. — 354 с.: іл.



Юрась Бушлякоў.
Жывая мова.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2013. — 294 с.: іл.



Сяргей Навумчык.
Дзевяноста першы.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2013. — 536 с.: іл.



Анатоль Лябедзька.
108 дзён і начэй у засьценках КДБ.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2013. — 434 с.: іл.



Валянцін Жданко.
Лісты на Свабоду.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2014. — 428 с.



Альгерд Бахарэвіч.
Каляндар Бахарэвіча.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2014. — 464 с.: іл.




Лісты пра Свабоду.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2014. — 314 с.




Жыцьцё пасьля раку.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2014. — 220 с.




Юры Дракахруст.
Сем худых гадоў.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2014. — 406 с.



Сяргей Навумчык.
Дзевяноста чацьверты.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2015. — 350 с.: іл.



(НЕ :)
вясёлыя карцінкі.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2014. — 64 с.: іл.




Уладзімер Арлоў.
Імёны Свабоды.
3-е выд., дап.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2015.
668 с.: іл.




Сяргей Абламейка.
Мой Картаген.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2015. — 316 с.: іл.




Сяргей Навумчык.
Дзевяноста пяты.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2015. — 324 с.: іл.



Сьвятлана Алексіевіч на Свабодзе.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2015. — 722 с.: іл.



Вінцук Вячорка.
Па-беларуску зь Вінцуком Вячоркам.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2016. — 364 с.: іл.




Сяргей Навумчык.
Дзевяноста першы.
2-е выд., дап.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2016. — 544 с.: іл.



Светлана Алексиевич на Свабодзе.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2016. — 744 с.: іл.








Зьміцер Бартосік.
Быў у пана верабейка гаварушчы...
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2016. — 326 с.: іл.

100 словаў.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2017. — 346 с.: іл.

Вінцук Вячорка.
Не сьмяшыце мае прыназоўнікі.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2017. — 316 с.: іл.







Сяргей Навумчык.
Дзевяноста другі.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2017. — 388 с.: іл.

Міхась Скобла.
Высьпятак ад Скарыны.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2017. — 500 с.: іл.

Івонка Сурвіла.
Дарога.
2-е выд., дап.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2018. — 174 с.: іл.








Сяргей Шупа.
Падарожжа ў БНР.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2018. — 282 с. + 56 с. укл.: іл.

Сяргей Абламейка.
Нечаканы Скарына.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2018. — 328 с.: іл.

Алена Струвэ.
Турма, жанчына і мужчына.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2018. — 434 с.








Сяргей Навумчык.
Дзевяноста трэці.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2018. — 536 с.: іл.

Зьміцер Бартосік.
Клініка кітайскага дантыста.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2018. — 284 с.: +24 с.: іл.

Сьвятлана Алексіевіч. 100 цытатаў на Свабодзе.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2019. — 268 с.



Сяргей Дубавец.
Тантамарэскі.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2019. — 356 с.



Алесь Пілецкі.
Казкі па целефоне.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2019. — 298 с.



Дзьмітры Гурневіч.
Забойства ў цэнтры Эўропы.
Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода, 2020. — 248 с.: іл.